ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СУБОТА, 30 жніўня 1930 г.
№ 202 (3800)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

32 рашаючых дні

З вялікім спазьненьнем савецкая грамадзкасьць даведалася аб выніках работы прамысловасьці ў ліпені. Толькі днямі, у канцы жніўня, апублікавана ліпеньская зводка ВСНГ.

Між тым, рабочыя і працоўныя БССР павінны былі ведаць яе значна раней. Зьмест зводкі ня можа ня выклікаць **трывогі** за выход другога году пяцігодкі. **Ліпень ня даў пералому.** Зруху няма. Прарывы не ліквідаваны. Поўнае выкананьне плянаў у сур'ёзнай небясьпецы.

Паслухайце.

У ліпені прадукцыя рэспубліканскае прамысловасьці ўзрасла параўнальна з чэрвеньскай на 6,2 проц. Пляцавае заданьне—13,3 проц.,—выканана, такім чынам, менш, чым **на палову.**

За 10 месяцаў гаспадарчага году мы дасягнулі **толькі 94,6 проц. пляну.** Па асобных галінах прамысловасьці яшчэ горш. Мэталь даў—92,9 проц. гадавога пляну, тэкстыль—81,6 проц.

Якасныя паказальнікі паранейшаму **значна** адстаюць ад колькасных. Прадукцыйнасьць працы ўзрасла на 26 проц. замест 35 проц. паводле пляну. Сабекошт зьніжаны на 7,6 проц., замест 11 проц. Дрэваапрацоўчая прамысловасьць пабіла ват рэкорд... **павышэньня** сабекошту: замест 12 проц. зьніжэньня яна дала рост на 1,7 проц.

Побач з усім гэтым, апошнія месяцы вызначаліся новым адмоўным зьявішчам—значнай **цякучасьцю рабочай сілы.** На фабрыцы «Дзьвіна» з 1-га студзеня па 1-га жніўня прынята на работу 811 чалавек, пакінула—765. На віцебскай панчошнай фабрыцы ім. Клары Цэткін звольнілася 230 чалавек. На цагельні № 2 прынята 380, пакінула работу—220 і г. д.

На некаторых прадпрыемствах гэта вялізная цякучасьць стварала рэальную пагрозу нармальнай рабоце паасобных цэхаў.

Дзе-ж прычыны прарываў у рабоце прамысловасьці? Хто канкрэтны вінаваты гэтых перабояў?

Матар'ялы, што друкаваліся ў «Зьвязьдзе», даюць адказы на гэтыя пытаньні. Вінавата адміністрацыя прадпрыемстваў, якая ня здолела зьвінчыць шматлікія вытворчыя непаладкі. Вінаваты прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі, якія не мабілізавалі мас. Вінаваты трэсты і аб'яднаньні, якія не наладзілі належнага кіраўніцтва прадпрыемствамі.

У апошнія часы значна павялічылася колькасьць рабочых, занятых у нашай прамысловасьці. На фабрыкі і заводы прышлі новыя людзі ад сахі ці з саматужнай майстэрні. Яны ня маюць яшчэ пралетарскага загартаваньня. Гэта—сыры матар'ял, з якога партыйныя ячэйкі і прафсаюзы павінны былі ляпіць новых сьвядомых рабочых, новых удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва. Задача вельмі цяжкая, задача вельмі адказная. Але як яе выпрацоўваюць на шмат якіх нашых прадпрыемствах?

Далёка, далёка нездавальняюча. **Масавая выхаваўчая работа моцна адстае ад патрабаваньняў рэканструкцыйнага пэрыяду.** На шмат якіх прадпрыемствах новыя кадры рабочых засталіся прадастаўленымі самі сабе. Адсталым настроям, прынесеным з дробнабуржуазнага асяродзішча, ня была процідастаўлена разгорнутая барацьба за выкарчоўваньне ўласьніцкай ідэалёгіі. Учарайшыя, індывідуальныя дробныя гаспадаркі не заўсёды былі ператвораны ў калектыўнага гаспадара буйнога грамадзкага прадпрыемства. Адсюль і заняпад працоўнай дысцыпліны на паасобных прадпрыемствах. Адсюль рвацтва, барбарскія адносіны да машыны і варштату, адсюль значнае перабяганьне з аднаго прадпрыемства на другое, адсюль праваапартуністычныя вылазкі.

У сёпешнім нумары «Зьвязды» чытач знойдзе падрабязны матар'ял аб гомельскай абутковай фабрыцы «Праца». Пра гэту фабрыку шмат ужо гаварылася і пісалася. Яна ўзята на грамадзкі буксір. Трывожныя зводкі ў працягу доўгіх месяцаў запаўняюць старонкі нашых газэт. А фабрыка ўсё яшчэ ня зьнята з чорнай дошкі, горы бракаваных вырабаў завальваюць фабрычныя памяшканьні. Тры дырэктары зьмяняюць пасьлядоўна адзін аднаго. Сакратар парткалектыву зьнімаецца з работы. **Буйнейшая ў БССР фабрыка абутку ператворана ў фабрыку браку.** Безнадзейна хворай прызнаў яе трэст; безнадзейна хворай абвясьцілі яе мясцовыя арганізацыі. І ў паветры носіцца новы «ратавальны» рэцэпт—часовае закрыцьцё фабрыкі. Заўважце—спыненьне вырабу востра-дэфіцытных ботаў, так неабходных для вёскі ў пэрыяд хлебазагатоўчай кампаніі!

Гомельская абутковая фабрыка—**горшая з грошых.** 50 проц. прамфінпляну. 100.000 пар недаданых краіне ботаў. 20 проц. росту сабекошту. Горы паўфабрыкатаў, якія гніюць, коштам у 350.000 руб. Залежы ў 40.000 загатовак. 50 проц. вышаўшых са строю машын. Вось балянс фабрыкі—адзінай, бадай, у Саюзе па выніках сваёй работы.

Гомельская абутковая, зразумела, выключэньне. Зразумела, такіх ганебных узораў работы ня знойдзеш на іншых беларускіх прадпрыемствах. Але ўсё-ж яе практыка заслугоўвае пільнага вывучэньня. У ёй у канцэнсаваным выглядзе прадстаўлена ўсё адмоўнае, якое перашкаджае пасьпяховай рабоце шмат якіх прадпрыемстваў. Непаладкі, арганізацыйная блытаніна, безгаспадарчасьць, бязьдзейнасьць, апартунізм, якія ледзь вызначаюцца на фоне іншых прадпрыемстваў, тут набылі вялікія, страшэнныя памеры. На фактах з жыцьця і работы «Працы», як праз лупу, можна лёгка вывучыць бактэрыі, якія зяпрыкметна затрымліваюць рост іншых фабрык і заводаў.

Дык што-ж парушыла работу гомельскай фабрыкі «Праца»?

Фабрыка нядаўна перажыла вялікі тэхнічны пераварот. З ручной яна была ператворана ў мэханічную. Патрабавалася 500 новых рабочых. Але адміністрацыя, фабком і ячэйка забыліся пра адну дробязь. Забыліся, што ўчарайшага шаўца, саматужніка трэба перападрыхтаваць, навучыць рабоце на машыне. Забыліся, што яго трэба перавыхаваць, зрабіць сьвядомым работнікам сацыялістычнага прадпрыемства. А ў выніку дробнабуржуазная стыхія заліла нашы прадпрыемствы, іржа ўласьніцкай ідэалёгіі разьела арганізм партыйнай арганізацыі. У выніку тыя ганебныя факты, аб якіх мы паведамлялі вышэй.

Трэба тут падкрэсьліць недапушчальную бязьдзейнасьць гомельскіх арганізацый. Фабрыка «Праца» знаходзілася літаральна пад бокам акругкому і райкому. **Толькі днямі** акругком вылучыў спэцыяльную тройку. Толькі днямі пастаноўлена ўжыць рашучыя меры. Чаму-ж упушчаны час? Чаму партыйныя арганізацыі дапусьцілі фабрыку да такога ганебнага банкрутства?

Паўтараем, «Праца»—выключэньне. Такіх прадпрыемстваў у нас, на шчасьце, больш няма. Але ўсё-ж гомельская рэчаіснасьць сыгналізуе. Яна яшчэ і яшчэ раз пацьвярджае, што шмат якія нашы арганізацыі **не павярнуліся тварам да вытворчасьці,** не адпавядаюць патрабаваньням, якія прад'яўляюцца да іх эпохай вялікай рэканструкцыі.

Мы зьяўляемся сьведкамі новай хвалі ўздыму і энтузіязму рабочых. Заклік ленінградскага заводу імя Карла Маркса знайшоў хуткі і гарачы водгук. Пачалася падрыхтоўка да сустрэчы новага гаспадарчага году. Струменем прапаноў рабочыя пракладаюць шлях сустрэчнаму прамфінпляну. Сьледам за «Беларускай» у паход за максымальную нагрузку прадпрыемстваў выступілі менскія абутнікі, рабочыя «Кастрычніка», «Камінтэрна», шчотачнай фабрыкі, «Энэргія» і інш. Ідзе пераклічка брыгад, цэхаў, прадпрыемстваў. Ідзе спаборніцтва за лепшую арганізацыю сустрэчнага прамфінпляну.

Але і на гэты раз прафсаюзы і некаторыя партыйныя ячэйкі засталіся ў баку ад масавага руху рабочых. За паасобнымі выключэньнямі ініцыятыва рабочых прафсаюзамі і адміністрацыяй не падхоплена. Наадварот, мы мелі факты яўнага і актыўнага процідзеяньня. На «Беларусцы» паасобныя члены бюро ячэйкі выступілі супроць сустрэчнага прамфінпляну. Майстры-камуністыя заяўляюць аб надмернасьці слабых тэмпаў, гэтым самым вывяўшы апартуністычны твар. ЦК гарбароў штампуе кантрольныя лічбы Белскураб'яднаньня для менскай абутковай фабрыкі, лічбы, перакінутыя ўжо сустрэчным плянам рабочых.

Да новага гаспадарчага году застаўся адзін месяц. Дакладней, 32 рашаючых дні. Навярстаць згубленае—гэтага патрабуе ад нас партыя і ўвесь край. Беларуская прамысловасьць павінна змыць з сябе ганебную пляму. Плян другога году пяцігодкі трэба чаго-б гэта ні каштавала выканаць.

Масы галасуюць за пяцігодку за тары гады. Пралетары вядуць зацятае змаганьне за ліквідацыю прарываў. З дарогі правых апартуністых, якія тармозяць, зрываюць справу сацыялістычнага будаўніцтва. Бязьлітас ны ўдар па тых, хто ня выконвае баявы загад партыі павярнуцца тварам да вытворчасьці.

Рашаючыя дні павінны быць і будуць днямі рашаючых посьпехаў.

Ліквідуем прарыў у выкананьні фінансавага пляну

У выніку невыкананьня плянавых заданьняў, прадугледжаных прамфінпляном, слабасьці крэдытнай дысцыпліны нашых гаспадарчых арганізацый і ў выніку не заўсёды выразнай работы крэдытнай сыстэмы маем значны прарыў у фінпляне.

Такое становішча прывяло да таго, што за апошні час мы перажываем цяжкасьці ня толькі ў галіне выкананьня ўсіх нашых гаспадарчых заданьняў, але і маем выпадкі перабояў у выплаце зарплаты.

Шляхі вырашэньня гэтых цяжкасьцей вызначаны пастановаю СНК БССР, апублікаванаю на днях у газэтах. Выкананьне ўсіх вызначаных гэтай пастановай задач дасьць магчымасьць ліквідаваць прарывы і выкаваць усе гаспадарчыя заданьні у тым ліку забясьпечыць сваячасовую выплату зарплаты.

Зусім ясна, што ні адзін сьвядомы рабочы, ні адзін працоўны ня можа і не запрапануе ліквідаваць прарывы з дапамогаю эмісіі, г. зн. выпуску новых грашовых знакаў, таму, што добра разумее, што гаспадарчыя прарывы ня могуць быць ліквідаваны гэтым самым небясьпечным і шкодным шляхам.

Пастанова СНК Саюзу, якая сёньня публікуецца, усклада на СНК БССР, усе гаспадарчыя органы, крэдытную сыстэму і каапэрацыйныя арганізацыі вялікія задачы і поўную адказнасьць за іх выкананьне ў працягу бліжэйшага месяца. Толькі для таго, каб ліквідаваць прарыў, нам трэба мабілізаваць 15 млн. руб., а дзеля таго, каб выпрастаць наш фінансавы фронт, поўнасьцю забясьпечыць выкананьне гаспадарчых задач і сваячасовасьць выплаты зарплаты, нам трэба мабілізаваць 28 млн. руб.

Гэтыя задачы будуць выкананы пры ўмове актыўнага ўдзелу ў гэтай справе ўсіх прафарганізацый, усіх рабочых, служачых, калгасьнікаў і шырокіх пластоў бядняцка-сераднякцкіх мас вёскі, выразнай работы ўсяго савецкага апарату, крэдытнай сыстэмы і каапэрацыйных арганізацый.

Трэба ўстанавіць такі парадак, каб штодня правяраць ход мабілізацыі сродкаў.

Слабыя раёны трэба брасьці на грамадзкі буксір больш моцным раёнам і арганізацыям. Трэба шырока скарыстаць сацспаборніцтва паміж паасобнымі раёнамі і паасобнымі арганізацыямі. Асаблівае месца гэтай важнейшай задачы павінен аддаць друк. Штодзённая дакладная інфармацыя аб ходзе выкананьня заданьняў па мабілізацыі сродкаў, папулярызацыя лепшых прыкладаў работы, падцягваньне і напамінаньне тым, што адстаюць, аб іх задачах і мабілізацыя грамадзкае думкі вакол гэтага важнейшага пытаньня—вось у асноўным кола задач нашай партыйнай і савецкай прэсы.

Заданьне будзе выканана, калі агульнымі намаганьнямі даб'емся штодзённага паступленьня ў касы Дзяржбанку аднаго мільёну рублёў. Ніякія іншыя агульныя разважаньні, апрача канкрэтнага выкананьня заданьня, справе не дапамогуць.

Побач з гэтым трэба пабальшавіцку брацца за выкананьне ўсіх якасных і колькасных паказальнікаў вызначаных прамфінпляном. К канцу гаспадарчага году мы павінны ліквідаваць гаспадарчыя прарывы і тады забясьпечым ліквідацыю прарыву ў фінансавым пляне.

К. Бэнэк.

Пастанова СНК СССР аб выкананьні фін. пляну БССР

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

1. Запрапанаваць Савету Народных Камісараў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі:

а) дадаткова мабілізаваць у IV квартале 1929-30 г. ня менш 15.000.000 рублёў ўродкаў насельніцтва шляхам спагнаньня пратэрмінаваных плацяжоў па сельска-гаспадарчым крэдыце, сельска-гаспадарчым падатку, страхаваньні і г. д., а таксама ўзмоцненага прыцягненьня аванасавых узносаў па адзіным сельска-гаспадарчым падатку і страхавых плацяжох; пры гэтым усе сабраныя сродкі павінны быць поўнасьцю сканцэнтраваны на спэцыяльным бягучым рахунку ў Дзяржаўным Банку Саюзу ССР і накіраваны на ліквідацыю прарываў фінансавага пляну Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, у тым ліку і па Лесбеле.

б) пераглядзець пляны будаўніцтва рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці з таким разьлікам, каб агульны кошт усяго будаўніцтва і разьмеры дакладных для яго крэдытаў упакіліся ў плянавую лічбу Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі Саюзу ССР; перавышэньне кошту капітальнага будаўніцтва і разьмераў даных для яго крэдытаў па адназй галіне павінна пакрывацца за лік скарачэньня па іншых.

2. З прычыны сыстэматычных парушэньняў крэдытнай і плянавай дысцыпліны беларускімі ўстановамі сельска-гаспадарчага крэдыту (накіраваньне належачых Дзяржаўнаму Банку Саюзу ССР сродкаў за сельска-гаспадарчыя машыны на іншыя мэты, сыстэматычны рост пратэрмінаваньня, няпрыняцьце мер да сваячасовага спагнаньня насеннай пазыкі, невыкананьне заданьняў па паянакапленьні), даручыць Дзяржаўнаму Банку Саюзу ССР і Саюзкалгасбанку ўвайсьці ў Савет Народных Камісараў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі з дакладам для неадкладнага прыцягненьня да адказнасьці ўсіх пасадавых асоб, якія дапусьцілі гэтыя парушэньні дысцыпліны.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў Саюзу ССР Я. РУДЗУТАК.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Савету Працы і Абароны Н. МАТВЕЕЎ.

Аб уборцы засеваў раскулачаных гаспадарак

ПАСТАНОВА НКЗ І КАЛГАСЦЭНТРУ СССР

У сувязі з тым, што ў радзе раёнаў пасевы былых кулацкіх гаспадарак не разьмеркаваны паміж калгасамі і што не арганізавана ўборка іх ураджаю там, дзе няма калгасаў, НКЗ і Калгасцэнтр СССР тлумачаць:

1. Пасевы былых кулацкіх гаспадарак там, дзе ёсьць калгасы, незалежна ад таго, ці знаходзяцца яны (у гаспадарках) зараз на тэрыторыі калгасаў, ці паза імі, паступаюць у поўнае распараджэньне калгасаў. Уборка іх ураджаю (жніво, малацьба і перавозка) робіцца калектыўна, сіламі калгасу. Увесь валавы збор хлеба з гэтых пасеваў залічваецца ў валавы прыбытак калгасу. Чысты прыбытак ад ураджаю пасеваў былых кулацкіх гаспадарак уносіцца на павялічэньне паявых узносаў батракоў і беднякоў у калгасы.

2. Пасевы былых кулацкіх гаспадарак, дзе няма калгасаў, паступаюць у поўнае распараджэньне камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, якія арганізуюць і адказваюць за сваячасовасьць уборкі ўраджаю.

3. Увесь ураджай пасеваў былых кулацкіх гаспадарак, за выключэньнем насеньня, неабходнага пад засеў гэтай плошчы ў будучым годзе, здаецца цалкам хлебазагатоўчым арганізацыям.

Згарэў завод імя Р. Люксэмбург

БАРЫСАЎ (па тэл.) 29 жніўня ўзьнік вялікі пажар на лесазводзе імя Розы Люксэмбург. Прыбыўшыя пажарныя дружыны не маглі дапамагчы заводу, бо двор прадпрыемства быў завалены рознымі матар'ялмі і сьмецьцем. Na працягу гадзіны завод быў ахоплены агнём і згарэў. Страты дасягаюць соцен тысяч руб. Паводле папярэдніх даных, пажар узьнік з-за нядбайнасьці і неасьцярожнасьці рамонтных рабочых.

Па справе врыштавана 5 чал.

Рэвалюцыйны рух

МАСАВА ПАКІДАЮЦЬ РАДЫ САЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫХ

БЭРЛІН, 25. За апошнія два месяцы ў Бэрліне **распаўся рад ячэек сацыялістычнага саюзу рабочай моладзі.** 50 членаў гэтых ячэек уступілі ў камсамол. У Саксоніі за апошні час у камсамол **уступілі 80 былых членаў «сацыялістычнага саюзу моладзі».** Гэтымі днямі старшыня арганізацыі сацыялістычнай моладзі ў Швангейме Гер падаў заяву аб уступленьні ў камсамол. На шматлюдным правыбарчым сходзе ў Дуісбургу кіраўнік мясцовай арганізацыі «рэспубліканскага сьцягу» заявіў аб сваёй пастанове ўступіць у кампартыю. У Бітфэльдзе **дэлегацкая канфэрэнцыя гарнякоў пастанавіла перадаць у выбарчы фонд кампартыі адну тысячу марак.** За гэту пастанову галасавалі шмат якія с.-д. рабочыя.

ЗАБАСТОЎКА ЗАКОНЧЫЛАСЯ ПЕРАМОГАЙ

АТЭНЫ, 28. Забастоўка атэнскіх будаўнічых рабочых (якія патрабавалі павышэньня зарплаты і ўвядзеньня 8-гадзіннага рабочага дня) **скончылася частковым задаваленьнем патрабаваньняў бастуючых.**

ПАМІЖ РАБОЧЫМІ І ЖАНДАРАМІ АДБЫЛАСЯ СУТЫЧКА

АТЭНЫ, 28. У Вало (прад на паўночным усходзе Грэцыі) у часе сьвята рабочых спартыўных арганізацый **паміж дэманстрантамі і жандармэрыяй адбылася сутычка.** Адзін жандарскі афіцэр паранены камянем 12 рабочых арыштавана.

НОВЫЯ ТЫСЯЧЫ—НА ВУЛІЦУ

ПАРЫЖ, 28. Як падаюць з Італіі, 2 жніўня адміністрацыя аўтамабільных заводаў «Фіат» абвясьціла аб новым звальненьні 8 тысяч рабочых. (ТАСС).

ПА КРЫВАВЫХ СЬЛЯДОХ ЦАРЫЗМУ

ВЕНА, 27. У Бухарэст прыбыў прадстаўнік кангрэсу амэрыканскіх яўрэяў — праф. Калумбійскага ўніверсытэту—Барон для азнаямленьня з пытаньнем аб яўрэйскіх пагромах. Барон устанавіў, што **міністэрства ўнутраных спраў знаходзіцца ў цесных адносінах з кіраўнікамі студэнцкіх фашысцкіх антысэміцкіх арганізацый.**

АДМОВІЛІСЯ ВЫСЛУХАЦЬ ПРАФБЮРАКРАТАЎ

ЛЁНДАН, 27. У адказ на пастановы адміністрацыі Лёндзанскай паўночна-усходняй чыгункі звольніць 31 чыгуначніка, чыгуначнікі пастанавілі абвясьціць італьянскую забастоўку. Адміністрацыя заклікала на дапамогу лідэраў рэфармісцкага саюзу чыгуначнікаў, рабочыя адмовіліся выслухаць прафбюракратаў. З прычыны таго, што забастоўка зусім дэзарганізавала работу станцыі, адміністрацыя вымушана была-б капітуляваць і адмяніць распараджэньне аб звальненьнях.

ПАРВАЛІ Ў КАВАЛКІ ПАРТРЭТ МУСАЛІНІ

ПАРЫЖ, 28. Як падаюць з Рыма, у апошні час у радзе раёнаў Паўночнай Італіі адбываліся сур'ёзныя хваляваньні сярод беспрацоўных. У Паданьяку **беспрацоўныя будаўнікі ў колькасьці 500 чал. наладзілі дэманстрацыю перад памяшканьнем мясцовых органаў улады,** патрабуючы работы і хлеба. Дэманстранты ўварваліся ў памяшканьне, **выбілі шыбы, пераламалі мэблю і дзьверы. Партрэты Мусаліні былі парваны ў кавалкі.** Дэманстранты былі разагнаны прыбыўшымі паліцэйскімі падмацаваньнямі. **Арыштавана звыш 100 чал.** (ТАСС).

ПАЦЫФІСЦКАЕ БЛУДАСЛОЎЕ

БЭРЛІН, 27. У Цурыху (Швэйцарыя) закончыўся пленум выканкому 2-га інтэрнацыяналу. Па асноўным пытаньні аб разбраеньні пленум ня даў ніякіх паказаньняў аб мерах барацьбы з ваеннай небясьпекай, а выказаў толькі **пажаданьне** наладжваць **пацыфісцкія маніфэстацыі** з мэтай зрабіць націск на Лігу Нацый. У вырашэньні індыйскага пытаньня 2-гі Інтэрнацыянал пацьвярджае ў асноўным свае надзеі на канфэрэнцыю «круглага стала».

У БОЙ ЗА СІЛАСІ

ПЕРАДАЙЦЕ ВАШ ВОПЫТ

ІНЖЫНЭРЫ, ТЭХНІКІ, АГРАНОМЫ, ПРЫМАЙЦЕ ЎДЗЕЛ У ЗАВОЧНАЙ КАНСУЛЬТАЦЫІ!

КАЛГАСЬНІКІ, САЎГАСЬНІКІ, АДЗІНААСОБНІКІ, ШЛЕЦЕ ЗАПЫТАНЬНІ!

АРГАНІЗУЕМ ЗАВОЧНУЮ КАНСУЛЬТАЦЫЮ

З месц паступаюць усё новыя і новыя вестні пра тое, што якасьць сілісаваньня кармоў зусім НЯВЫСТАРЧАЛЬНАЯ. Шмат якія калгасы і саўгасы, прыступаючы да сілісаваньня, ня маюць ніякага вопыту, ніякіх ведаў і практыкі ў гэтай справе. Сіласная маса, засіласаваная абыяк, пачынае гніць. Падкрэсьліваем—гэта ў большасьці выпадкаў вынік адсутнасьці ўсякага вопыту і практыкі ў сілісаваньні.

Арганізацыя завочнай кансультацыі, якая-б давала калгасам і саўгасам адказ на любое практычнае пытаньне—зусім насьпеўшая рэч «Зьвязда» арганізуе на сваіх старонках такую кансультацыю і заклікае ўсіх спэцыялістых, аграномаў, тэхнікаў, калгасьнікаў прыняць у ёй самы актыўны ўдзел.

Выклік спэцыялістых НКЗ БССР, які друкуецца ў сёнешнім нумары «Зьвязды», павінен прыкаваць шырокую грамадзкую ўвагу. Усе спэцыялістыя жывёлагадоўлі і паляводзтва, аграномы, тэхнікі, калгасьнікі прымеце самы актыўны ўдзел у завочнай кансультацыі. Кансультацыя па сілісным будаўніцтве і сілісаваньні кармоў, якая арганізуецца на старонках «Зьвязды», ставіць перад сабой баявыя і гаварovыя задачы. Вопыт спэцыялістых—у гушчу калгасных і адзіннаасобных батрацка-бядняцкіх і сераднякцкіх мас. Падвядзем пад сілісаваньне навуковую і тэхнічную базу, узброім калгасы і саўгасы вопытам сілісаваньня. Калгасьнікі, саўгасьнікі, адзінаасобнікі шлеце ў «Зьвязду» ўсе запытаньні, якія цікавяць вас па сілісным будаўніцтве і сілісаваньні кармоў.

Спэцыялістыя, аграномы, тэхнікі на старонках «Зьвязды» і праз пісьмовую сувязь будуць даваць вам самыя дакладныя адказы як будаваць сілісныя ямы, траншэі, вежы, як засілісаваць зялёную масу, скарыстоўваць сілас і г. д. Завочная кансультацыя—новая магутная зброя ў барацьбе за сілас. Калгасьнікі, саўгасьнікі, адзінаасобнікі—беднякі і сераднякі, поўнасьцю скарыстайце гэтую зброю.

Шлеце ў «Зьвязду» запытаньні, зьвязаныя з сіласам, якія вас цікавяць. ВЫ АТРЫМАЕЦЕ САМЫ ДАКЛАДНЫ АДКАЗ.

Прымайце наш выклік

Улічваючы ўсю важнасьць арганізацыі шырокай пісьмовай кансультацыі па сілісным будаўніцтве і сілісаваньні кармоў і шырокага ўкараненьня ў масы калгасьнікаў, саўгасьнікаў і бядняцка-сераднякцкіх мас асноўных прыёмаў тэхнікі сілісаваньня ва ўмовах БССР,—бярэм на сябе абавязак да канца сілісаўнай кампаніі сыстэматычна асьвятляць ўсе пытаньні сілісаваньня кармоў і даваць адказы на запытаньні з месц у гэтым абсягу.

Выклікаем прыняць актыўны ўдзел у кансультацыі і асьвятленьні ўсіх пытаньняў сілісаваньня будаўніцтва, сілісаваньня кармоў, скарыстаньня сілясу і падрыхтоўкі да будучай сілісаўнай кампаніі наступных таварышоў:

т. **Журыка** (сьвінаводная станцыя),

т.т. **Рабіновіча і Драздова** (НДІ),

праф. **Архіпава** (Віцебскі вэтінстытут),

праф. **Пелехава** (Горацкі зоатэхн. інстытут),

т. **Варкунова** (Калгасцэнтр),

т. **Каплана** (Белмалжывсаюз),

т. т. **Сасноўскага і Гурыновіча** (Белкалгасбуд).

Спэцыялістыя НКЗБ
Малаш, Жыркевіч, Заяц.

АМАТАРЫ „АБ'ЕКТЫЎНЫХ" ПРЫЧЫН

БЕЛКАЛГАСБУД І БЕЛМАЛЖЫВСАЮЗ ПРАВАЛЬВАЮЦЬ ЗБОРКУ СІЛАСНЫХ ВЕЖАЎ.

75 стандартных сіласных вежаў гатовы. Але для іх зборкі падрыхтавана толькі 9 фундамантаў.

Зборка стандартных сіласных вежаў паранейшаму не праводзіцца. 75 вежаў гатовы. Аднак, амаль усе яны валяюцца на мясцох у разобраным стапе. На сёнешні дзень прыступлена да зборкі ўсяго **5** сіласных вежаў. Падрыхтавана ўсяго 9 фундамэнтаў.

Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз увесь час спасылаліся на «аб'ектыўныя» прычыны. Баяцце, для зборкі сіласных вежаў няма драўляных і мэталёвых частак. Зараз гэтых прычын няма. Ударнікі Бабруйскага камбінату ў баявым парадку выпусьцілі 75 камплектаў драўляных частак для вежаў. «Союзколхозстрой» поўнасьцю завёз у БССР мэталічныя часткі.

Чаму-ж, аднак, зборка сіласных вежаў злачынна **зрываецца.** Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз, убачыўшы, што спасылаецца на адсутнасьць мэталёвых і драўляных частак нельга, вышукваюць новыя «аб'ектыўныя» прычыны. Цяпер Белкалгасбуд спчыць, што ў яго няма дэмэнту. Для поўнага выкананьня пляну патрэбна 1.800 бочак цэмэнту. Белкалгасбуд мае пакуль што толькі 800. Але мы пытаемся: ці скарыстаны гэтыя 800 бочак цэмэнту? **Бясспрэчна, ня.** Не пайшлі-ж 800 бочак цэмэнту на закладку... 9 фундамэнтаў. І нарэшце, чаму Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз пальцам не паварушылі, каб забясьпечыць будаўніцтва патрэбнай колькасьцю цэмэнту?

Рабочай сілы не хапае. Патрэбна мінімум 1.000 чалавек, а працуе на Беларусі толькі халя 200. Што-ж робяць Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз, што ўжываюць яны, каб ліквідаваць дэфіцыт у рабочай сіле? **Нічога.** Паўтараем, Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз **шукаюць іншых «аб'ектыўных» прычын, каб скінуць з сябе адказнасьць за зрыў** будаўніцтва і зборку сіласных вежаў.

Мясцовыя арганізацыі не дапамагаюць будаўніцтву і зборы вежаў. Шмат якія калгасы ігнаруюць гэту справу.—«Нам вежы непатрэбны, няма часу займацца сіласаваньнем» — заўважаюць яны. Калгасы **«Праца»** (Ветрынскі раён), імя **Чарвякова** (Віцебскі раён), **«Зальшавік»** і імя **Фалько** (Самахвалавіцкі раён) катэгарычна адмовіліся ад зборкі вежаў. У Сьмілавіцкім раёне калгас **«Савецкая Беларусь»** таксама ня хоча будаваць сіласную вежу. Гэта — выніх **нікуды нявартай ластаноўкі** растлумачальнай работы.

Будаўніцтва і зборка стандартных сіласных вежаў стаяць пад сур'ёзным ударам. Пры дзяперашнім ходзе работы будаўнічы плян будзе сарваны. Даволі напамінаньняў. Да адказнасьці Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз. Трэба сурова асадзіць аматараў «аб'ектыўных» прычын.

С. Г—н.

Па Савецкім Саюзе

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ СВАЯЧАСОВУЮ ВЫПЛАТУ ЗАРПЛАТЫ

ЦКК-РСІ РАЗАСЛАЛА ЎСІМ КК-РСІ НАСТУПНЫ ЦЫРКУЛЯР:

Пастановай Савету Народных Камісараў СССР ад 16-га жніўня г.г. усе гаспадарчыя органы абавязваюцца складаць і выконваць свае фінансавыя пляны з такім разьлікам, каб у межах устаноўленых для іх крэдытных лімітаў бязумоўна была забясьпечана сваячасовая выплата заработнай платы. Пры гэтым на органы Дзяржбанку ўскладзена — ва ўсіх выпадках патрабаваньня гаспадарчымі органамі, пры сканчэньні іх лімітаў, па-за плянавых крэдытаў на заработную плату, — дрэвесьці аб гэтым да ведама органаў РСІ э прадстаўленьнем неабходных матар'ялаў для прыцягненьня да адказнасьці асоб, якія парушылі памянёную пастанову СНК СССР.

КК-РСІ прапануецца ў самым тэрміновым парадку дакладна разглядзець прадстаўляемыя Дзяржбанкам матар'ялы, выяўляць пэрсанальны вінаўнікаў і неадкладна прыцягваць апошніх да адказнасьці.

АРГАНІЗАЦЫЯ БЮРО РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ АПАРАТУ

Калегія НК РСІ СССР канстатавала, што арганізацыі работы савецкага апарату не адпавядае задачам і тэмпам рэканструкцыйнага пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва. Калегія НК РСІ пастанавіла, каб установы Саюзнага, рэспубліканскага і абласнога значэньня ў двухмесячны тэрмін арганізавалі бюро рацыяналізацыі апарату. Рацыяналізацыя апарату павінна заключацца ва ўсёбаковым пільным пераглядзе і паляпшэньні функцый структуры апарату. Трэба сыстэматычна адбіраць і ўкараняць у абавязковым парадку ва ўсім дзяржапараце праверяныя на практыцы рацыяналізатарскія мерапрыемствы.

СКАРЫСТАНЬНЕ 10-ПРОЦАНТНЫХ АДЛІЧЭНЬНЯЎ З РЭАЛІЗАВАНЫХ ПАЗЫК

Урадам устаноўлены дзесяціпроцантныя адлічэньні ў мясцовы бюджэт з рэалізаваных сумы пазык. Наркамфін СССР ня раз зазначаў мясцовым фінорганам і касіям садзейнасьці, што аб'екты будаўніцтва за лік дзесяціпроцантных адлічэньняў павінны быць абмеркаваны ў друку, на шырокіх сходах працоўных, пленумах выканкомаў.

Спэцыяльнае абсьледваньне РСІ паказала, што адлічэньні пазык фактычна ня вылучаюцца і выдаткоўваюцца ў агульнай масе бюджэтных сродкаў. Цэнтральная камісія прапанавала рэспубліканскім камісіям садзейнасьці запатрабаваць ад абласных і краёвых камісій даклады аб скарыстаньні на іх тэрыторыі дзесяціпроцантных адлічэньняў па пазыцы «Пяцігодка—за чатыры гады».

12 ГОД З ДНЯ ЗАМАХУ НА ТАВ. ЛЕНІНА, АРГАНІЗАВАНАГА ЭСЭРАМІ. На здымку момант замаху

Барацьба ў Індыі

Паўстаньне ў Пешавары разгараецца

ЛІГА РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ МОЛАДЗІ ЖЫВЕ!

СЯЛЯНЕ ДАПАМАГАЮЦЬ ПАЎСТАНЦАМ

СТАМБУЛ, 29. Як паведамляе англійская «Сівіль Пайонір» у Індыі, цяперашняе паўстаньне пламён паўночна-заходняй правінцыі характэрна тым, што насельніцтва вёсак каля Пешавару дапамагае паўстанцам, якія прышлі з гор, хавае іх і забясьпечвае харчамі: пламёны навучыліся хавацца ад нападаў самалётаў, разьбіваючыся на дробныя групы і дасканала маскуючыся. Іх страты ад паветраных бамбардовак невялікія.

«СЛАВА ВЯЛІКАМУ ЛЕНІНУ»

СТАМБ

Ці ўсё гатова да навучальнага году?

ТЭРМІНЫ ПРАЙШЛІ А:

Наркаматы і гаспадарчыя органы ня склалі плянаў падрыхтоўкі спэцыялістых. Будаўніцтва с. г. Акадэміі сарвана. Разьвёрстка па ўкамплектаваньні пэдтэхнікумаў ня выконваецца

На грамадзкі буксір падрыхтоўку кадраў спэцыялістых

Лист у «Зьвязду»

Пяцігадовы плян падрыхтоўкі рабочых кадраў спэцыялістых—пад пагрозай зрыву. Лічу неабходным зьвярнуцца да вас з гэтым лістом, каб узяць на грамадзкі буксір справу падрыхтоўкі кадраў спэцыялістых, бо гэта справа ў некаторых бюракратычных частках савецкага апарату (аддзел кадраў ВСНГ, Наркамзему і г. д.) не атрымала таго месца, якое яна павінна была заняць згодна дырэктыў партыі і ўраду.

Усім вядома, якое вялізарнае значэньне набывае ў цяперашні час, у пэрыяд рэканструкцыі ўсёй нашай народнай гаспадаркі—пытаньне кадраў наогул і кадраў спэцыялістых асабліва. Нашы саюзныя і беларускія ўрадавыя органы, улічваючы гэта своячасова, далі адпаведныя заданьні ўсім наркаматам і гаспадарчым арганізацыям аб складаньні ўдасканаленых плянаў па паасобных галінах народнае гаспадаркі, пяцігадовага пляну патрэбнасьці і пакрыцьця (а таксама падрыхтоўкі) кадраў кваліфікаваных рабочых і кадраў спэцыялістых з вышэйшай і сярэдняй асьветай. Атрымаўшы папярэднія матар'ялы ад ведамстваў і гаспадарчых арганізацый Дзяржплян БССР увесну гэтага году склаў адпаведныя плины.

Але цяпер, улічваючы значныя зьмены, унесеныя ў пяцігадовыя пляны паасобных галін народнае гаспадаркі БССР, улічваючы ўстаноўку па выкананьне пяцігодкі за чатыры, а ў некаторых галінах нават і ў тры з паловаю гады,—гэтыя пляны ўжо ўстарэлі і патрабуюць значнага ўдасканаленьня. **Між тым нашы наркаматы і гаспадарчыя органы вельмі доўга марудзяць з гэтым пытаньнем і ня гледзячы на шматлікія напамінаньні з боку Дзяржпляну—і да гэтага часу ня прыступілі да работы.**

Трэба зараз-жа ўсім нашым ведамствам і гаспадарчым органам разам з Дзяржплянам ва ўдарным парадку распрацаваць плян падрыхтоўкі рабочых кадраў і кадраў спэцыялістых вышэйшай і сярэдняй асьветы, інакш адзін з найбольш важных вучасткаў нашага гаспадарчага і культурнага фронту застанецца аголеным.

Кіраўнік сэктару працы навукі і культуры Дзяржпляну БССР
БАЛАБАНАЎ.

Будаўніцтва с.-г. акадэміі сарвана

Своячасовае скончэньне будаўніцтва с.-г. акадэміі мае вялікае значэньне асабліва ў зьвязку з пашыраным прыёмам у гэтым годзе. Пастановай Саўнаркому ад 22/VII — 30 г. —гэта будаўніцтва аднесена да першачарговага, павінна было быць у першую чаргу забясьпечана будаўнічымі матар'яламі, рабочай сілай.

Былі вызначаны пэўныя тэрміны скончэньня паасобных будынкаў. Між іншым БЕЛДЗЯРЖБУД І НЯ ДУМАЕ ВЫКОНВАЦЬ ПАСТАНОВЫ САЎНАРКОМУ. Больш таго. У апошні час Белдзяржбуд вывез паўтара вагона жалеза з гэтага будаўніцтва ў Віцебск, скараціў штат рабочых, звольніў 30 каменшчыкаў. На будаўніцтве не хапае цэмэнту —прывозіць яго ніхто ня думае. Замест таго, каб своячасова зрабіць заказы на рамы, вокны і дзьвары, толькі цяпер прараб напісаў у Аршанскую кантору аб гэтым заказе. Кэпі-ж прыступяць да яго выкананьня—невядома.

Нічога ня зроблена ў напрамку забясьпячэньня будаўніцтва патрэбнай колькасьцю атынкоўшчыкаў. Яшчэ ня ведаюць, якое будзе ацяпленьне, а вызначаныя тэрміны праходзяць.

Прараб будаўніцтва Нісукаў на нарадзе заявіў, што скончэньне інтэрнату на 900 асоб ня будзе выканана да студзеня, між тым як тэрмін яго 1-га КАСТРЫЧНІКА. Будынкі (тэрмін скончэньня якіх ўжо даўно прайшоў)—гідралябараторыя, бібліятэка і ільнялябараторыя не канчаюцца, ня гледзячы на тое, што там засталося зрабіць толькі электраправодку і сходы ў некаторых дзьвярох.

Спэцыялістыя каменшчыкі працуюць на чорных работах і атрымліваюць пэнсію па сярэднім заработку.

Раённыя і Аршанскія арганізацыі не зварачаюць ніякай увагі на будаўніцтва.

Б'ЕМ ТРЫВОГУ. Зрыў будаўніцтва выклікае за сабой зрыў новага прыёму ў акадэмію, зрыў навучальнага году. НК ВСІ—зрабіў належныя вывады ў адносінах да нядбайнасьці, цяганіны мясцовых раённых і Аршанскіх кіраўнічых арганізацый. Г. Д.

Навярстаць упушчанае ня позна

Праз некалькі дзён лябараторыі навучальных устаноў пачнуць працаваць. Між тым, выкананьне разьмеркаваных па округах раскладак — на мёртвай кропцы. Адсюль, **укамплектаваньне Магілеўскага палітасьветнага тэхнікуму правальваецца.** На сёньняшні дзень прыслана заяў і дакумантаў ад 149 асоб, што складае 49,7 проц. агульнага ліку набору на першыя курсы. Больш за ўсё адстаюць у адносінах выкананьня разьвёрсткі — **Мазырская акруга, якая замест 31—12, Бабруйская замест 36—10, Менская замест 46—11, Гомельская замест 41—16 заяў.**

Акругкомам, якія ліквідуюцца, трэба атрымаць колькасьць месц у тэхнікум разьмеркаваць па раёнах, а райкомам — навярстаць упушчанае як мага хутчэй. ЖУКАЎ.

Сёньня адчыняецца ўсебеларуская нарада па пытаньнях вышэйшай пэдагагічнай асьветы

ЦК нашай партыі даў наступную дырэктыву па пытаньні падрыхтоўкі пэдкадраў: **«зьвярнуць асабліву ўвагу на марксысцка-ленінскую падрыхтоўку і палітычную кваліфікацыю пэдкадраў. Прыняць усе меры да ўзмацненьня камуністычнага і рабочага ядра сярод пэдагагічных кадраў. Прапанаваць ЦК ЛКСМ на працягу 3-х год выпучаць і накіроўваць, у парадку мабілізацыі, кожны год ня менш 20.000 членаў ЛКСМ для работы ў школах па ўсеагульным навучаньні для камплектаваньня пэдагагічных навучальных устаноў».**

У пэдагагічным ВНУ і пэдтэхнікумы па дырэктыве ЦК КП(б)Б камсамол павінен быў мабілізаваць у бягучым навучальным годзе 1.500 членаў ЛКСМБ. Дырэктыва ЦК КП(б)Б зрываецца. Так, напрыклад, віцебскі акругком замест вызначаных 40 членаў камсамолу ў віцебскі індустрыяльны пэдагагічны інстытут накіраваў пакуль што 3-х таварышоў. Ня лепш стаіць справа з укамплектаваньнем гомельскага агракалгаснага пэдагагічнага інстытуту і магілеўскага грамадазнаўча-літаратурнага пэдагагічнага інстытуту. У больш спрыяючых умовах, у адносінах камплектаваньня, знаходзіца пэдфак БДУ.

Сёньня адчыняецца першая ўсебеларуская нарада па пытаньнях вышэйшай пэдагагічнай асьветы. Гэтая нарада мае выключнае значэньне ў справе стварэньня пералому ў падрыхтоўцы пэдагагічных кадраў. Яна кладзе пачатак рашучай перабудовы вышэйшай пэдагагічнай асьветы ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду, кладзе пачатак рашучай палітэхнізацыі, а таксама пралетарызацыі нашых вышэйшых пэдагагічных устаноў.

СЯЎБА ПАЧАЛАСЯ

Рагачоўскі раён сее першым

Расьнянскае і Дрысенскае партыйна-савецкае кіраўніцтва кулаку на выгаду сарвала падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі

ЗАСЫПАНА ТОЛЬКІ 10% НАСЕННЫХ ФОНДАЎ

Рашаючыя дні павінны быць днямі рашаючых посьпехаў

НІ АДНЭЙ ХВІЛІНЫ!

Тэлеграф прынёс паведамленьне: Рагачоўскі раён першым у БССР **пачаў сяўбу.** Калгасьнікі дружна выйшлі на поле. Першыя гэктары засеяны з уздымам.

На жаль, на сёньняшні дзень такое паведамленьне—**адзінкавы факт.** Раёны ганебна марудзяць з пачаткам асеньняй пасеўнай кампаніі. Месцы рыхтуюцца да асеньняй сяўбы **зусім нездавальняюча.** Асобныя раёны зацягнулі ўборку і да гэтага часу не паладзілі абмалоту. Абмалот у большасьці месц праходзіць дрэнна: малатарні не нагружаны. У той час, як у адных раёнах малатарні працуюць у адну зьмену з далёка няпоўнай нагрузкай, у іншых раёнах няма зусім малатарань і новы ўраджай стаіць не абмалочаны. Марудны абмалот—сур'ёзная пагроза посьпеху сяўбы. Усякая павольнасьць у абмалоце толькі адцягвае тэрміны сяўбы і не дае магчымасьці калгасам і саўгасам кінуць свае сілы на падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі. Гэтага не зразумела расьнянская партыйна-савецкае кіраўніцтва (гл. карэспандэнцыю «На руку кулаку»), якое дапусьціла поўны правал абмалоту ў раёне.

Апартуністыя з расьнянскага кіраўніцтва спакойна назіраюць як у раёне правальваецца ўборка, як на палёх гінуць сотні гэктараў няўбраных пасеваў, як кулацтва агітуе калгасьнікаў за выхад з калектываў. З Дрысы нам паведамляюць, што з-за злачынай бязьдзейнасьці раённых устаноў асеньняя сяўба знаходзіцца ў небясьпецы. У самыя гарачыя, рашаючыя дні папярэдні сяўбы, кіраўніцтва райкалгассаюзу, аграномы ідуць у адпачынак. Калгасы пакідаюцца на волю хваль. У раёне пануе праваапартуністычны самацёк. Бюракраты і апартуністыя прымушаюць калгасьнікаў Дрысенскага раёну скарачаць пасеўную плошчу, пакідаюць калгасы без машын. За такія справы мала зьнімаць з работы. Пад суд іх! Закляйміць гэтых работнікаў грамадзкай ганьбай, як шкоднікаў бальшавіцкай пасеўнай кампаніі. Расьнянскі і дрысенскі факты—грозное папярэджаньне. У гэтых раёнах павінны быць ужыты самыя надзвычайныя мерапрыемствы аж да рашучага аздараўленьня партыйна-савецкага кіраўніцтва. Сурова ўдарым па правых апартуністых, якія кулаку на выгаду імкнуцца затармазіць і сарваць выкананьне нашых пасеўных плянаў. Выявім чынуш і бюракратаў, дзе-б яны не акапаліся. Мы нікому не дазволім затармазіць пасеўную кампанію. Сяўба павінна пачацца своячасова. Зараз-жа праверыць усе вучасткі пасеўнай кампаніі. Памятайце, засталося толькі некалькі рашаючых дзён.

Кантрактацыя і ссыпка насенных фондаў амаль не разгорнута. Зводкі б'юць трывогу. Лічбы вінаваціць як раённыя, так і цэнтральныя адпаведныя ўстановы (НКЗ, Белкалгасцэнтр, Белпаляводсаюз і г. д.) у слабых, зусім слабых тэмпах работы. Плян засыпкі насенных фондаў, паводле апошніх даных выканаць толькі на **10 проц.** Ня лепшы—таксама і процант кантрактацыі. На гэтыя баявыя вучасткі пасеўнай кампаніі трэба зьвярнуць баявую ўвагу. На барацьбу за поўнае выкананьне плянаў кантрактацыі, за датэрміновую засыпку насенных фондаў.

Нельга марна губляць ні аднэй хвіліны.

ВЫЙШЛІ НА СЯЎБУ

РАГАЧОЎ. (Наш. спэц. кар.). У Рагачоўскім раёне ПАЧАЛАСЯ СЯЎБА АЗІМЫХ. Падрыхтоўка да сяўбы ў асноўным праведзена добра. Плян асеньняй сяўбы даведзены да калгасаў і сельсаветаў. Першыя дні сяўбы прайшлі добра. Калгасьнікі заяўляюць, што яны скончаць сяўбу азімых да 15-га верасьня.

НОВЫ КАЛГАС

УВАРАВІЧЫ, 29. (НАШ КАР.). ПОСЬПЕХІ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ УВАРАВІЦКАГА РАЁНУ ВЫКЛІКАЛІ НОВЫ ПРЫЛІЎ У С.-Г. АРЦЕЛІ. ГЭТЫМІ ДНЯМІ У В. КРЫЎСК АРГАНІЗАВАЎСЯ НОВЫ КАЛГАС ІМЯ БУДЗЁНАГА НА ПЛОШЧЫ Ў 226 ГА. НОВЫЯ КАЛГАСЬНІКІ ЗЬВЯРНУЛІСЯ З ПРЫВІТАНЬНЕМ У РАЁННЫ КАМІТЭТ ПАРТЫІ, У ЯКІМ ЗАЯЎЛЯЮЦЬ, ШТО ЯНЫ БУДУЦЬ НЯЎХІЛЬНА ЗМАГАЦЦА ЗА ДАЛЕЙШАЕ РАЗЬВІЦЬЦЁ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Дапамаглі калгасу „Маяк сацыялізму"

Калгас «Маяк сацыялізму» (Барысаўшчына) паставіў пытаньне—своячасова закончыць уборачную кампанію. На рабочым пляне ў калгасе маецца недахоп—14030 чалавека-дзён. Праўленьне, улічыўшы гэты недахоп, зьвярнулася да вайсковай часьці 42 эскадрона за дапамогай, якая хутка арганізавала масавы выхад у поле. Зразумела, што гэты дзень сапраўды пасіў балвы напрамак на сельска-гаспадарчым фронце.

Чырвонаармейцы ня толькі дапамаглі ўборцы ўраджаю, але сваім прыкладам падцягнулі адсталых калгасьнікаў.

На парозе поўнага правалу

ДРЫСА, 28. Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы ў Дрысенскім раёне ПРАВАЛЕНА. Да сёньняшняга дня НІ Ў АДНЫМ КАЛГАСЕ НЯМА ПЛЯНУ асеньняй пасеўнай кампаніі. Аграномы пайшлі ў адпачынак і таму плянаў асеньняй сяўбы не складаюць. Райкалгассаюз БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЕ. З 5 членаў праўленьня 4 пайшлі ў адпачынак.

Некаторыя калгасы да гэтага часу ня ведаюць, дзе яны будуць сеяць. Калгасы «КАМІНТЭРН», «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ» і інш. не падрыхтавалі папару пад азіміну, бо ў іх яшчэ не праведзена зямляўпарадкаваньне. Ёсьць сур'ёзная небясьпека, што ў бягучым годзе пасеўная плошча ў Дрысенскім раёне ЗЬМЕНШЫЦЦА. Шмат якія калгасы з-за поўнай адсутнасьці ўгнаеньня мяркуюць СКАРАЦІЦЬ пасеўную плошчу. калгас «ПЕРАМОГА», напрыклад, скарачае пасеўную плошчу параўнальна з мінулым годам на 10 ГА. Калгасы скарачаюць пасеўную плошчу з-за адсутнасьці угнаеньня, а ў гэты час на складах райкалгассаюзу валяюцца 600 тон розных угнаеньняў.

С.-г. машыны і інвэнтар да асеньняй сяўбы зусім НЕ ПАДРЫХТАВАНЫ. На дварэ райкалгассаюзу ІРЖАВЕЮЦЬ пад адкрытым небам двухконныя плугі, дыскавыя бораны, радавыя сявалкі і г. д. Між тым, некаторыя калгасы ў Дрысенскім раёне ня маюць машын. Так, батрацкі калгас імя Варашылава не атрымаў НІ АДНАЕ с.-г. машыны.

Ачыстка насеньня ў раёне НЕ РАСПАЧАТА. Усе калгасы прыступілі да абмалоту і сям-там ужо засыпаны насенныя фонды, аднак, яшчэ ні ў адным сельсавеце НЕ ПРАЦУЮЦЬ абозы па ачыстцы насеньня. Гатунковае насеньне ў раён НЕ ЗАВЕЗЕНА. Мабілізацыя мясцовых рэсурсаў зусім не разгорнута. Напрыклад, калгас «Перамога» мае звыш 6 тон лішкаў гатунковага насеньня, якое НЕ РЭАЛІЗУЕЦЦА. Калгасы «ПЕРАМОГА», «ПРАЎДА» і інш. не праводзяць аграмінімуму. Вапнаваньне і тарфаваньне глебы САРВАНА. Праўленьні калгасаў заяўляюць, што «гэтай справай няма часу займацца».

Раённыя ўстановы спадзяюцца на самацёк і зусім не падрыхтаваны да асеньняй сяўбы. Калгасы прадастаўлены самі сабе.

Варта адзначыць, што паасобныя калгасы, ня гледзячы на ўсякую адсутнасьць кіраўніцтва і практычнай дапамогі з боку раённых устаноў, здавальняюча праводзяць уборку ўраджаю і рыхтуюцца да асеньняй сяўбы. Калгасы «БАРАЦЬБІТ», «МАЯК» і інш. пачалі ПРАВОДЗІЦЬ СПРАВАЗДАЧНУЮ КАМПАНІЮ СЯРОД АДЗІНААСОБНІКАЎ. У часе справаздачнай кампаніі ў калгас УСТУПІЛА 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ў камуну «Маяк» 10.

Падкрэсьліваем, Дрысенскі раён стаіць на парозе поўнага правалу асеньняй пасеўнай кампаніі. Гэтага нельга дапусьціць.

КУРГАН.

НА РУКУ КУЛАКУ

РАСНА, (наш кар.). Становішча ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы ў **Расьнянскім** раёне зьвяўляецца выключна **пагражаючым.**

Уборка ўраджаю недапушчальна **зацягваецца.** Ва ўборачнай кампаніі пануе адачыны самацёк. У некаторых калгасах дагэтуль няма вытворчых плянаў уборачнай кампаніі. Адсутнасьць зьдзельшчыны ў калгасах і нікуды ня вартая арганізацыя працы прывялі да таго, што ў раёне значная частка сенажаці і азімых яшчэ няўбрана. Сотні га жыта знаходзяцца ў небясьпецы. У Пяскоўскім калгасе яшчэ ня ўбрана 500 га пасеваў. У калгасе няма рабочай сілы, аднак, раённыя арганізацыі ня прыходзяць на дапамогу. У калгасе «Чырвоны Факел» няўбраны 100 га гатунковага жыта. **Жыта гніе ў снопах на полі.** Між тым, «Чырвоны Факел» павінен забясьпечыць сваім гатунковым насеньнем **усе** іншыя калгасы.

Абмалот у раёне зусім неарганізаваны. Малатарні не падрыхтаваны. Райкалгассаюз выдаваў калгасам нікуды нівартыя малатарні, на якіх нельга малаціць збожжа. Дзьве складаныя малатарні, якія ёсьць у раёне, стаяць бяз руху. Асеньняя сяўба пад сур'ёзнай пагрозай. Расьнянскі раён мае падзолістую глебу, якая абавязкова патрабуе вапнаваньня.

Аднак, завоз вапны ў раён сарваны. У райкалгассаюзе бяз усякай карысьці дляжыць угнаеньне. Рамонт інвэнтару ідзе самацёкам. Машыны да сяўбы яшчэ не падрыхтаваны. Ні адна машына па ачыстцы насеньня, якая ёсьць у раёне, не скарыстоўваецца. Усе 16 машын па ачыстцы насеньня стаяць на складах. Ганебна слаба ідзе кантрактацыя азімых пасеваў. Варта адзначыць, што раён не падрыхтаваўся да хлебазагатоўчай кампаніі. Раённае партыйна-савецкае кіраўніцтва бязьдзейнічае. Кулакі, скарыстоўваючы правалы раённых арганізацый ва ўборачнай кампаніі і падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы агітуюць пэўную частку адзінаасобнікаў за выхад з калгасаў. У выніку зусім нездавальняючай, дрэннай пастаноўкі ўборачнай кампаніі 26 бядняцка-сераднякіх гаспадарак за апошні час выйшлі з калгасаў. Раённае кіраўніцтва і на гэты факт не рэагавала. Адказныя расьнянскія работнікі падпалі пад уладу ліквідацыйных настрояў, разважаючы, што «нас усё-роўна зьменіць, калі прыедуць працаўнікі з акругі». Патрэбна карэннае аздараўленьне апартуністычнага расьнянскага кіраўніцтва.

П. В. М—ў.

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ

ГАВОРАЦЬ ЗВОДКІ ПЕРШЫХ ДЗЕН

Індывідуальны сэктар значна адстае

ПРАВІЛЬНАЯ КЛЯСАВАЯ ЛІНІЯ—ЗАЛОГ ПОСЬПЕХУ КАМПАНІІ

Гнаць з хлебазагатоўчага фронту апартуністых, якія скажаюць партыйныя дырэктывы

Матар'ялы з месц сьведчаць пра тое, што ў большасьці раёнаў самая элементарная падрыхтоўка да хлебазагатовак праведзена нездавальняюча.

Арганізацыйныя памылкі і недахопы ў падрыхтоўцы скарыстоўвае ў сваіх мэтах вясковы кулак і спэкулянт. Клясавы вораг разьвівае агітацыю сярод адзінаасобнікаў, угаварваючы іх не здаваць хлеба дзяржаве. Кулак працягвае руку гарадзкому спэкулянту. У некаторых мясцох кулак наймае сваіх агентаў для скупкі і продажу хлеба.

Але належны адпор кулацтву не падрыхтаваны. У радзе месц кулацкія гаспадаркі не атрымалі цьвёрдых заданьняў і тэрмінаў здачы хлеба.

Пры слабым апартуністычным нацыску на кулацтва ў некаторых мясцох дапушчаюцца перагібы ў адносінах да беднякоў і сераднякоў.

Так, напрыклад, як паведамляе тав. **Г. Ч.**, у вёсцы Вурсом'е, **Бягомльскага сельсавету з бядняцкага сходу былі выгнаны сераднякі.**

У Нідэльскім сельсавеце была склікана «батрацка - бядняцкая група». На ёй амаль ня было беднаты — былі служачыя. Гэта «група» пастанавіла навысіць кантрольныя лічбы на 400 проц., высунула свой «сустрэчны прамфінплян». Калі гэтыя лічбы пачалі даводзіць да паасобных вёсак, там іх воража сустрэлі, бядняцтва і сераднятва зусім рашуча выказалася супроць згары навязанага пляну.

Наперакор зразумелым дырэктывам партыі, Мсьціслаўскі і Церахаўскі райкомы КП(б)Б прапануюць давесьці пляны загатовак да кожнага двара, у той-жа час Церахаўскі райком папярэджвае месцы, каб ня было летаніх перагібаў.

Паведамленьні з месц стракацяцца данымі пра здачу хлеба чырвонымі абозамі з калгасаў. Але індывідуальны сэктар вёскі амаль ня прыступіў да здачы хлеба. Між тым, арганізацыя адзінаасобнікаў з самага пачатку кампаніі для здачы хлеба дзяржаве зьяўляецца аднэй з важнейшых умоў посьпеху хлебазагатоўчай кампаніі.

Дрэнна са складамі.

Тав. **Е. Н.** паведамляе, што склады **Бялыніцкага** райспажывецкага таварыства — адзінага хлебазагатоўшчыка па раёне, — заражаны доўганосікамі, кляшчом, дахі ў дзірах, супроць пажарнае абсталяваньне дрэннае, дэзінфэкцыя ня зроблена. Стары хлеб у Магілеў ня зьвезены, а ляжыць у складах пры высокай насыпцы, што пагражае псаваньнем яго. Кіраўнікі спажыўтаварыства сьпяць, як быццам, хлебазагатоўкі іх не датычаць. Пляны загатовак не даведзены да сельсаветаў.

Пра ненадрыхтаванасьць складаў паведамляюць і з **Копыскага раёну, Аршанскае акругі.** У вёсцы Маслакі да сёньняшняга дня склад яшчэ не адрамантаваны. У Копысі ёсьць вольны каменны склад, але Камгас адмаўляецца здаць яго пад ссыпны пункт, заяўляючы, што памяшканьне патрэбна для жыльля.

Такі-ж малюнак у **Расонскім раёне,** Полацкай акругі, згодна карэспандэнцыі тав. **Федарышчанка.**

— На сходзе ўпаўнаважаных спажывецкай каапэрацыі, — піша селькор **Р. Дрозд,** — выявілася, што раён не падрыхтаваны да загатовак. У Мар'іной Горцы толькі цяпер пачаўся рамонт складаў. У Шацку ідуць гарачыя спрэчкі Райпаляводсаюзу з спажывецкай каапэрацыяй за памяшканьне пад ссыпны пункт — райпаляводсаюз трымае ключы ад складу ў сябе, у той час, калі РВК перадаў гэты будынак спажывецкаму таварыству. Яшчэ горш у Талькаўскім спажывецкім таварыстве—старшыня праўленьня ня ведае колькі патрэбна тары і колькі мяшкоў залатана. Пляны да калгасаў, вёсак і кулацкіх гаспадарак не даведзены.

Тав. **Папянскі** піша з Каралінскага раёну, што яшчэ ня прыступлена да малацьбы жыта. Упаўнаважаныя па хлебазагатоўках нічога ня робяць, каб арганізаваць малацьбу, каб мабілізаваць вакол загатовак грамадзкую думку. Калгас «Чырвоны Араты» амаль усё сваё жыта на 19 га злажыў на полі і зараз варожыць — як бы гэта перамаладзіць яго.

Брыгадзір «Зьвязды» тав. **Бірштэйн** паведамляе з **Крупскага** раёну, што пляны загатовак дагэтуль спакойна ляжаць пад спудам у сельсаветах, ня гледзячы на тое, што яны былі пасланы яшчэ 9 жніўня. Крупскі раён павінен загатовіць 720 тон хлеба. Ня гледзячы на прапанову РВК скончыць распрацоўку плянаў да 15 жніўня, сельсаветы яшчэ не давялі заданьня да вёсак, кулацкіх двароў і калгасаў. Некаторыя сельсаветы, каб паскорыць уборку хлеба, карыстаюцца агідными сапраўды галавацяпскімі мэтадамі.

Старшыня Надзькінскага сельсавету выдаў аднэй бядняцкай пісьмуль, каб ёй адпусьцілі 5½ літраў гарэлкі для тых, хто дапамагаў ёй ва ўборцы.

Такім чынам, як мы бачым, справа стаіць дрэнна як з давядзеньнем пляну да паасобных вёсак і сельсаветаў, так і з падрыхтоўкай складаў.

Між тым, давядзеньне пляну да вёскі, абмеркаваньне яго на бядняцка-сераднякіх сходах зьяўляецца важнейшай арганізацыйнай работай, без праведзеньня якой нельга чакаць пасьпяховага разгортваньня хлебазагатоўчай кампаніі.

Арганізацыйная і масавая растлумачальная работа недапушчальна спазьнілася. Каб дагнаць прапушчанае, трэба напружыць усе сілы і ў бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому ў хлебазагатоўках.

Работу ўсіх мясцовых арганізацый, усёй грамадзкасьці трэба пераключыць на баявыя тэмпы, якіх патрабуе хлебазагатоўчая кампанія. Трэба рашуча ўдарыць па прымірэнчых адносінах да кулака, не дапушчаючы адначасова ніякіх перагібаў у адносінах да бядняцка - сераднякіх гаспадарак.

87,5 проц. месячнага пляну

Весткі аб ходзе хлебазагатовак, атрыманыя Белпаляводсаюзам, прымушаюць чакаць значна лепшага. Яны сьведчаць аб тым, што на мясцох яшчэ не падыйшлі да хлебазагатовак як да найважнейшай гаспадарчай кампаніі. 46 раёнаў зусім не прадставілі Белпаляводсаюзу вестак аб загатоўках. Некаторыя раёны паведамілі, што яны яшчэ «толькі прыступілі да гэтай справы».

На 25-га жніўня сыстэмай Белпаляводсаюзу загатоўлена: жыта — па калгасах — 5.264 цэнтн., па індывідуальным сэктары — 281 цэнтн., пшаніцы — па калгасах — 86 цэнтн., па індывідуальным сэктары — 3 цэнтнэры; ячменю — па калгасах — 1.685 цэнтн., па індыв. сэктары — 20; аўсу — па калгасах — 142 цэнтнэры, па індывідуальным сэктары —44 цэнтн. Усяго паступіла 7.616 цэнтн. збожжа. Папярэдзе ідуць Буда-Кашалёўскі, Брагінскі, Жлобінскі, Клімавіцкі і Слуцкі раёны. **На 25-га жніўня Белпаляводсаюзам выканана 87,5 проц. месячнага пляну загатовак.**

Гэтыя лічбы паказваюць, што па індывідуальным сэктары загатоўкі разгортваюцца вельмі слаба. Чырвоныя абозы арганізуюць выключна калгасьнікі. Гэта сьведчыць аб слабой растлумачальнай рабоце сярод адзінаасобнікаў.

Пляны хлебазагатовак у большасьці даведзены да раёнаў, затое аб іх вельмі мала ведаюць у калгасах і паасобных дварох.

11-га жніўня праўленьне Белкаапсаюзу разаслала па раёнах інструкцыю аб парадку прэміяваньня здатчыкаў. Але **тавары, вызначаныя на 3-ці квартал, ня гледзячы на шматлікія патрабаваньні, не паступілі на месцы. Пакуль што няма чым прэміяваць.**

Л—н.

Пляны збожжазагатовак у габінэтах

Пляны збожжазагатоўчай кампаніі па **Магілеўскаму** раёну яшчэ да гэтага часу валяюцца ў габінэтах спажывецкага т-ва. Толькі 11 жніўня старшыня спажывецкай каапэрацыі прышоў у РВК узгадняць складзены плян збожжазагатовак.

Калі-ж гэтыя пляны будуць даведзены да кожнага калгасу і да паасобнай бядняцка-сераднякай гаспадаркі? — Пэўна не раней, чымся ў канцы жніўня.

Магілеўскі РК КП(б)Б павінен напомніць збожжазагатоўчым арганізацыям раёну пра дырэктывы партыі ў гэтай галіне.

А. М.

Чырвоныя абозы з калгасаў

БАБРУЙСК. (Наш кар.). У Чырвонаслабодзкім раёне нарастае хваля чырвоных абозаў. Калгас «Дук» 17-га жніўня здаў каля 7 тон жыта Саюзхлебу на ст. Слуцак, 25-га жніўня арганізаваў чырвоны абоз калгас «Новы Шлях», які даставіў на ссыпны пункт каля 33 тон жыта і 8 тон пшаніцы.

Здаюць добраахвотна свае пішкі і адзінаасобныя гаспадаркі.

Па ўсіх сельсаветах прыступлена да правядзеньня бядняцкіх і агульных сходаў.

* * *

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). 20-га жніўня чырвоныя абозы калгасьнікаў і адзінаасобнікаў Пабалаўскага сельсавету прывезьлі 50 тон збожжа.

* * *

ЛЁЗНА. (Наш кар.). У мястэчка прыбылі чырвоныя абозы ў колькасьці 55 фурманак з калгасаў «Полымя», «Зьвязда», «Чырвоны Кастрычнік» і «Чырвоны Араты», якія здалі свае пішкі дзяржаве. На мітынгу прадстаўнікі калгасаў заявілі, што яны зараз здаюць толькі першы абмалот і што ніаднаго кілё хлеба ня будзе прадана прыватнікам. Прыёмны апарат хутка справіўся з разгрузкай фурманак. За поўгадзіны было ссыпана ў склады 20 тон збожжа.

Скокі лічбаў

ЧАШНІКІ, (наш кар.). Ад нашай падрыхтаванасьці да хлебазагатовак залежыць посьпех гэтай важнейшай кампаніі. Як мы рыхтуемся?

Віцебскі акрвыканком у першым паказаньні прапануе Чашніцкаму раёну захоўваць наступныя адносіны загатовак культур: жыта 50 проц., яравога збожжа 50 проц.

Праз некалькі дзён ён зьмяняе свае лічбы; жыта ўжо трэба загатовіць 25 проц., яровага збожжа—75 проц. Гэта яшчэ ня ўсё.

АВК прапануе раёну загатовіць ад калгасаў 458 тон, а ад адзінаасобнікаў... 274 тоны. Бачыце, гэтакія кантрольныя лічбы прапануюцца ў той час, калі індывідуальны сэктар займае ў раёне 80 проц. Ня ведаем, чым думалі працаўнікі АВК, калі складалі гэтыя лічбы.

Райвыканком практычна падышоў да выпрацоўкі кантрольных лічбаў. Ён намецілі кантрольнае заданьне—для калгасаў 290 тон, а для індывідуальнага сэктару вёскі—557 тон збожжа. Гэтыя лічбы разьмеркаваны па сельсаветах.

Раптам прыходзіць новая тэлеграма ўжо з акркалгассаюзу—у тэлеграме новыя лічбы-калгасам даецца норма ў 89 тон.

Узьнікае пытаньне: каму патрэбны гэтыя скокі лічбаў? Яны толькі затрымліваюць ход загатовак і ўносяць блытаніну ў разьмеркаваньне кантрольных лічбаў. Гэта блытаніна грае на руку кулаку.

М. Кажарскі.

Абломавы з райпаляводсаюзу

БЯГОМЛЬ. (наш кар.). Раённы паляводны саюз сьпіць непрабудным сном. Што яму кантрактацыя, што яму хлебазагатоўкі? «Яшчэ пасьпеем, ды нельга адразу ва ўсё ўхапіцца»—гаворыць працаўнікі паляводсаюзу, ня ведаючы, што ўборка азімага кліну закончана і што ўжо да ссыпных пунктаў пацягнуліся чырвоныя абозы з калгасаў.

Куды ссыпаць хлеб, калі не гатовы склады?

Няма на пунктах такой рэчы, як вагі. Чым будуць важыць жыта, адзін алах ведае.

Райпаляводсаюз прывёз малатарні для ўборкі ўраджаю, а прывадоў няма. Ляжа малаціць, калі няма прывадоў? На складах райпаляводсаюзу няма запасных частак да машын, да зарэзу патрэбных калгасам.

Трэба, як належыць, ударыць па абломавых в Бягомльскага райпаляводсаюзу.

А. П.

Партыйнае будаўніцтва

З БАЛЬШАВІЦКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЮ

біць па правых апартуністых—кулацкай агентуры ў радох партыі

Праваапартуністычныя вылазкі ў парт'ячэйцы НКЗ

Партячэйка НКЗ не правяла адпаведнай работы для таго, каб выкараніць прышчэпаўскія настроі сярод работнікаў апарату НКЗ. А гэтыя настроі прышчэпаўшчыны маюць месца ня толькі сярод беспартыйных супрацоўнікаў наркамату, а і нават сярод асобных членаў партыі. Аб гэтым выразна сьведчыць рад канкрэтных прыкладаў, якія выкрыты камісіяй Фрунзаўскага райкому КП(б)Б, якая зараз праводзіць абсьледваньне партячэйкі НКЗ.

Кіраўніцтва ячэйкі не мабілізавала шырокіх партыйных мас для барацьбы з рэшткамі прышчэпаўскіх настрояў, ячэйка не давала адпору тым вылазкам кулацкай агентуры ў партыі, якія мелі месца ў ячэйцы на працягу апошняга пэрыяду. **Член партыі Селязьнёў** у час абгаварэньня вынікаў работ XIII зьезду КП(б)Б выступіў з яўна - апартуністычнай прамовай, з нападкамі на генэральную лінію партыі. Між тым ён не атрымаў адпору ад партыйнага сходу. Член партыі **Бедны** пры абмеркаваньні пытаньня аб гаспадарчых цяжкасьцях прапануе раўняцца на вузкія месцы, падтрымліваючы і апраўдваючы настрої кулацтва і іншых сацыяльна-варожых элемэнтаў. Гэты «камуністы», які стаў рупарам сацыяльна-варожых элемэнтаў, таксама не атрымаў рашучага адпору з боку ячэйкі.

Падобныя настроі ёсьць і сярод часткі беспартыйных спэцыялістых. На адчыненым сходзе парт'ячэйкі адзін адказны супрацоўнік зьмяняўпарадчага сэктару **Шмэрлінг** гаворыць: «палітыка партыі па вёсцы вядзе да голаду, да жабрацтва». І гэта хлусьліва-паклёпніцкая прамова, як і папярэднія дзьве, не атрымала адпору.

Кіраўніцтва ячэйкі вакол гэтых канкрэтных вылазак правых апартуністых, вакол варожага выступленьня Шмэрлінга не мабілізавала партыйнай масы для барацьбы на выкарчоўваньні прышчэпаўскіх настрояў у апараце НКЗ.

Асобныя работнікі НКЗ па практ

ЛІКВІДУЕМ АКРУГІ, УМАЦУЕМ РАЁНЫ.

ТЭРМІНОВЫЯ АДНОСІНЫ Ў... НЯІСНУЮЧЫЯ ЎСТАНОВЫ

КАЛІ-Ж, НАРЭШЦЕ, НАШЫ НАРКАМАТЫ НАЛАДЗЯЦЬ СУВЯЗЬ З РАЁНАМІ?

Мінула дэкада з таго дня, як рэдакцыя «Зьвязды», разам з ЦК РСК зрабіла налёт на некаторыя наркаматы і буйныя гаспадарчыя ўстановы з мэтай праверкі наколькі ў сапраўднасьці наркаматы павярнуліся тварам да раёну.

Што-ж мы маем на сёнешні дзень у прыватнасьці, як выконваецца на практыцы пастанова ЦК УсеКП(б) ад 15-га ліпеня, у якой гаворыцца: «галоўная увага павінна быць зьвернута на выкарыстаньне вызваленых акруговых работнікаў».

21 і 25 жніўня прэзыдыум ЦВК БССР заслухоўваў справаздачныя даклады Чашніцкага і Калінкавіцкага райвыканкомаў. З дакладаў вынікла, што наркаматы, калі ня лічыць зьвестак статыстычнага характару, абсалютна ня зьвязаны з установамі памянёных раёнаў.

На жаль, гэтыя два раёны не зьяўляюцца выключэньнем. Інструктаваньня і дапамогі ў работе райвыканкомаў у цяперашні пераходны пэрыяд наогул няма. За тое ня сьпіхае пераманьваньне ў цэнтр акруговых работнікаў.

Чаго варты, напрыклад, струмень тэлеграм НКЗ, што нічэ ў Мазырщчыну, з кароткімі і выразнымі загадамі: «адкамандыраваць» у цэнтр работнікаў і даць іх характарыстыкі... Цікавая дэталь: даведаць у Наркамземе ня ведалі, што за асобы сядзяць у акруговым апараце, і толькі зараз узьнікла патрэба запытацца пра іх.

16-га жніўня спынілі сваё існаваньне тры округі, у тым ліку—Менішчына.

Але наркаматы шлюць—і невядома дакуль ніччо будуць дасылаць—важныя, **тэрміновыя адносіны па адрасе менскага АВК.**

Адносіны ў няіснуючую ўстанову, зразумела, не даходзяць па прызначэньні і добра паблукаўшы трапляюць да ўрадавай камісіі на ліквідацыі округ...

У Віцебскай і Менскай округах параней шаму дрэнна справа з разьмеркаваньнем акруговых работнікаў. Большменш адавальняюча ў гэтых адносінах толькі на Аршанщчыне. Там станоўча вырашана пытаньне аб пасылцы на раён спэцыялістых. Так, з 127 спэцыялістых-зямлеўпарадкавацеляў не знайшлося ні аднаго «дэфэртыра»; усе добраахвотна ідуць у пізавы апарат.

У НКЗ нас «супакоілі», што з округамі зараз існуе сувязь толькі па пытаньні іх ліквідацыі. З гэтым можна згадзіцца. Але за тое ніяк нельга згадзіцца з тэндэнцыяй разбуханьня штатаў самога НКЗ і «падвышэньня» ў пасадах акруговых работнікаў, за лік адрыву іх ад раёнаў.

— Мы бярэм новых людзей у свой апарат, каб лепей зьвязацца з раёнамі. —кажа намесьнік наркома т. Масякоў.

Гэта, мякка кажучы, спрычны мэтад замацаваньня сувязі з раёнамі...

І чамусьці адказныя работнікі акруговых земаддзелаў, вылучаюцца, на пасады дырэктароў навучальных устаноў НКЗ. За кошт акруговых спэцыялістых узмацняецца інструктарска - рэвізорская частка цэнтральнага апарату.

А раёны... Праўда, у раёны пасылаецца 7 чалавек з апарату НКЗ...

Раёны чакаюць канчатковага замацаваньня апарату. У шмат якіх раёнах мы стаім напярэдадні зрыву асеньняй пасеўнай кампаніі.

ЦКЗ у сувязі з гэтым мабілізаваў 50 работнікаў для правядзеньня ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы—але, калі яны паедуць на месцы—невядома.

У Наркамасьветы адразу пасьля надрукаваньня ў «Зьвязьдзе» матар'ялаў налёту склалі камісію па ўстанаўленьні непасрэднае сувязі з раёнамі. Гэтымі днямі на калегіі НКА стаіць даклад гэтае камісіі.

У сувязі з ліквідацыяй акруговых устаноў даўным-даўно былі пасланы на раён інспэктары. Цяпер яны памалу вяртаюцца ў Менск. Што яны прарабілі на мясцох, асабліва ў трох округах, ліквідаваных з 15 жніўня, у НКА ня ведаюць.

Намесьнік наркома тав. **Вожык** зазначыў толькі, што пасьля заўтра справаздача гэтых інспэктароў будзе стаяць на вузкай калегіі НКА.

У цэнтральны апарат улічваецца 13 акруговых работнікаў. Колькі-ж пасылаецца з цэнтру на раён—на гэта пытаньне, як і на шмат іншых, нам не ўдалося атрымаць адказу, колькі мы не вандравалі па вілаватых калідорах Наркамату асьветы.

Ужо некалькіх прыведзеных фактаў даволі для таго, каб мець поўную рацыю адзначыць:

— Наркаматы не сканцэнтравалі патрэбнае ўвагі на пытаньні ліквідацыі округ і ўмацаваньня раёнаў, як асноўных зьвяньняў сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

Г—

Не адцягваць выезд у раён

Дырэктыўны ліст ЦКК КП(б)Б усім АКК-РСІ і ліквідкомам Віцебскае, Аршанскае і Менскае округ

З месц паступаюць весткі, што частка членаў партыі, якая атрымала пуцёўкі на выезд у раёны для пастаяннай работы на месцы ня выяжджае і на рознага роду прычынах адцягвае выезд.

Улічваючы, што несваячасовая яўка ў раёны рады работнікаў ставіць пад нагрозу выкананьне раду важнейшых заданьняў і тармозіць выкананьне пастаноў ЦК і 16 партыезду ад узмацненьні раёнаў і хутчэйшым перакіданьні з округ у раёны работнікаў,—прэзыдыум ЦКК даручыў старшыням АКК асабіста запяцца праверкай і выяўленьнем усіх членаў партыі, якія ня выехалі ў раёны.

Такое адцягваньне выезду ЦКК будзе разглядаць, як адмаўленьне ад выезду.

Усіх тых, што атрымаўшы пуцёўку, ў працягу 3-х дзён ня выехалі на месца работы, папярэдзіць аб тэрміне іх выезду і паведаміць у ЦКК.

Адначасова ЦКК даручае заняцца таксама праверкай сваячасовага аслабаненьня з округ усіх тых работнікаў, якія павінны выехаць на раён і забясьпечыць ім магчымасьць сваячасовага выезду.

Нам. Старшыні ЦКК КП(б)Б ІВАНОЎ.

Вучоба—шыльда,

за якой хаваюцца акруговыя работнікі

ПОЛАЦАК. (Брыгада «Зьвязды»).

Ліквідацыя Полацкае округі праходзіць бяз удзелу шырокіх працоўных мас гораду і вёскі. Грамадзкая думка не згуртавана вакол гэтага важнейшага мерапрыемства. У выніку, мы маем рад фактаў, калі, як адказныя працаўнікі, так і спэцыялістыя, усімі мерамі імкнуцца ўхіліцца ад паездкі на работу ў раён.

Да канчатковае ліквідацыі округі засталося ўсяго 2 тыдні. У раёнах адчуваецца вельмі вострая патрэба ў работніках, між тым, на сёнешні дзень амаль ні адзін з атрымаўшых пуцёўкі, раён не паехаў. Дырэктыва ЦК УсеКП(б) аб пасылцы ў раён 90% акруговых работнікаў—акругкомам таксама ня выканана. Рад кіруючых работнікаў акруткому і РВК, замест работы ў раёне, едзе на вучоба. Наогул вучоба стала зараз тэй шыльдай, якой карыстаюцца многія работнікі, каб пазбавіцца ад работы ў раёне.

Наркамзем і Наркамфін, замест замацаваньня раёнаў, імкнуцца перацягнуць некаторых Полацкіх работнікаў у Менск. Двое агранамаў, каб ня ехаць у раён, паступілі настаўнікамі ў тэхнікум. Аграном Лаўрык «прыстроіўся» ў Менску. Прафсаюзныя арганізацыі і акруговая газэта «Чырвоная Полаччына» на ўсе гэтыя факты зусім не рэагуюць.

ЗАЙЦАЎ.

Тры месяцы—

будзе „ліквідавацца" Менакрмалжыўсаюз

Нядаўна Менскі Акруговы Малочна-жывёлагадоўчы саюз склікаў прадстаўнікоў раённых т-ваў на нараду па пытаньні аб ліквідацыі акруговых устаноў. На гэтай нарадзе Праўленьне Малжывёлагадоўчага саюзу выступіла з прапановай стварыць Ліквідацыйную Камісію з штатам у 15 чал., з якіх пяць «адказных», з акладам партмаксімуму. Акрач гэтага, праўленьне прапанавала пакінуць на работе на два месяцы загадчыка гаспадаркай для сдачы сталоў, крэслаў і былога загадчыка апрацыйнай часткі **Цівіна** на 2 с паловай месяцы для праверкі ўзаемных разлікаў з Белмясам. Тэрмін ліквідацыі вызначаны мінімум — 3 месяцы. Выдаткі на утрыманьне ўсяго ліквідкому вызначаны праўленьнем у 7000 руб.

Прадстаўнікі раёнаў выступілі супроць тэндэнцыі праўленьня — расцягнуць ліквідацыю Менакрмалжыўсаюзу на такі доўгі тэрмін. Але ў галасаваньні гэтага пытаньня прыймалі ўдзел усе працаўнікі будучага Ліквідкому. Ня дзіва, што большасьцю галасоў была ўхвалена прапанова праўленьня. Мы лічым, што такім тэндэнцыям праўленьня Мен. Акрмалжыўсаюзу трэба паклаесьці канец.

ПРОКШЫЦ.

Ультыматум каморніка Касьмовіча

Началося з таго гістарычнага дня, калі Менскаму каморніку **Касьмовічу** было прапанавана зямляўпарадкаваць вялікі калгас «Новы Шлях» у Астрашыцка-Гарадзецкім раёне.

У той дзень тав. Касьмовіч прад'явіў старшыні праўленьня «Новага Шляху» свой першы ультыматум:

— Буду працаваць у вас толькі ў тым разе, калі вы дасьцё мне чыстую, сьветлую кватэру ў 2 пакоі, плюс: стол для канцылярыі — 2×1,5 мэтра, стол сталовы, стол невялічкі, 2 слонцы, дзьвае табурэткі, 3 эзэдлікі, 2 ложкі, вялікую лямпу і адзін кубамэтр дроў. Зразумела, што памяшканьне павінна быць вымыта.

Усё ахаціла гаспадарчае вока менскага каморніка. Засталося толькі дадаць, каб сталы былі зроблены пад дуб, альбо арэхавага дрэва з інкрустацыямі, каб на ложках зьяяў нікель, а эзэдлікі былі абавязкова венскія, пры гэтым —сьветлыя, бяз дзірачак (па 6 руб., у МІДЕ).

Сяльсці патрабаваньне аказалася лягчэй, чымся выканаць. І тав. Касьмовіч быў прымушаны паслаць старшыні напамінак:

Ня гледзячы на маю просьбу, а ваша абяцаньне, усё-ж такі мне няма як разьмясьціцца ў кватэры. Прашу паведаміць мне ў Астрашыцкі Гарадок заўтра, да 12 гадзін дня, — ці ёсьць магчымасьць пераехаць, а то прыдзецца распачаць працу з калгаса «Прамень Сацыялізму» (ля самага мястэчку—Ю. Л.).

У калгасе «Новы Шлях» 90 гаспадарак не ўпарадкаваны і з дня на дзень чакаюць прыезду каморніка... Кватэру тав. Касьмовічу падшукалі самую лепшую — у школе, абклеілі яе, падлогу адрамантавалі, што-кольвеч з мэблі набылі... А тав. Касьмовіч зноў піша старшыні праўленьня калгасу:

— Стол, які ёсьць у клюбе — вузкі. Неабходна, каб вы загадалі сталяру зрабіць яго з хваёвых дошак і каб ён быў ладна склеены.

Усьлед за гэтым паляцеў чацьверты —і апошні — ультыматум менскага каморніка, на гэты раз ужо ў РВК:

— Ня гледзячы на шматразовыя звароты да старшыні калгасу «Новы Шлях» аб садзейнічаньні ў падшуканьні і абсталяваньні кватэры для канцылярыі і жыльля, лагэтуль я не магу прыступіць да працы, бо няма дзе распалажыцца з матар'яламі і інструмэнтамі. Просьба прапанаваць тав. Няхайчыку (старшыня калгасу — Ю. Л.) у працягу бліжэйшых сутак выканаць маю просьбу.

Старшыня Райвыканкому — тав. Сьмяргоўч накладае рэзалюцыю:

— Праўленьню калгаса: Неабходна забясьпечыць прыладамі.

Тры разы каморнік Касьмовіч ганяў за 22 вярсты ў Менск калгасных коняй; прабыў у «Новым Шляху» 13 дзён, узяў 40 літраў малака і... ня разу ня выйшаў на поле.

Зараз ён у Менску.

...Касьмовічы яшчэ жывуць. Грэюць рукі ля нашых кастроў, вітаюць рэформы і падтрымліваюць лёзунгі.

Юр. ЛЯВОННЫ.

ЗЬВЯЗДА

ГОРШАЯ З ГОРШЫХ

ФАБРЫКУ АБУТКУ ПЕРАТВАРЫЛІ Ў ФАБРЫКУ БРАКУ

Ганебны баляне фабрыкі «Праца»: 100.000 недаданага абутку.—50 проц. выкананьня праграмы.—Горы няскончанай прадукцыі.—3.000 няпарных ботаў. — 20 проц. павышэньня сабекошту.—50 проц. нескарыстанага абсталяваньня.

Залежы бракаванага абутку на фабрыцы «Праца».

Дробнабуржуазная стихія захліснула наша прадпрыемства. —Барбарскае абыходжаньне з машынамі.—Рабскія адносіны да працы. — Яскравыя ўзоры праваапартуністычнай практыкі.

МЫ ПАТРАБУЕМ:

1. Чысткі партыйнага і камсамольскага калектываў „Працы".
2. Бязьлітаснага адпору правым апартуністым.
3. Неадкладнага ўзмацненьня кіраўніцтва.
4. Звальненьня шкоднікаў, сабатажнікаў і рвачоў.

Чорная дошка заслужана

Гомельская абутковая фабрыка «Праца» амаль ня сыходзіць са старонак друку. І сапраўды, няма здаецца яшчэ падобнай фабрыкі **ва ўсім СССР**, якая-б працавала так дрэнна.

За 10 месяцаў фабрыка выканала сваю вытворчую праграму толькі **на 50 проц.**, прычым, калі іншыя прадпрыемствы, якія маюць вытворчыя прарывы, **у апошнія месяцы** падцягваюцца і імкнуцца выканаць свае праграмы, **фабрыка «Праца» у ліпані і жніўні выканала праграму на 40 проц.** Гэта значыць, фабрыка «Праца» **працуе ўсё горш.** Запазычанасьць фабрыкі — **100.000 пар ботаў.**

Заданьне аб зьніжэньні сабекошту ня выканана. Наадварот, замест зьніжэньня сабекошту на 20 проц. ёсьць **павышэньне сабекошту.** Пара ботаў замест 10 руб. 79 кап. каштуе фабрыцы 13 руб. 25 кап. **Каля 50.000 руб. страціла фабрыка ў выніку невыкананьня дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту.**

Запазычанасьць фабрыкі банку складае **звыш паўмільёна руб.** Банк пазабаўлены магчымасьці забясьпечваць фабрыку свячасова грашыма нават для выплаты зарплаты. У гэты-ж час на фабрыцы гніюць вялікія запасы паўфабрыкатаў, якія ацэньваюцца **ў 350.000 рублёў.** Адных толькі падрыхтаваных загатовак налічваецца каля 40.000 пар.

Якасьць прадукцыі фабрыкі — надзвычай дрэнная. Скаргі на дрэнны абутак — звычайнае зьявішча. 50 проц. наяўнага запасу паўфабрыкату зроблена нядбайна. Колькасьць браку і ботаў 3-га гатунку — вялікія горы. Замест 70-80 проц. першагатуновага абутку фабрыка выпускае толькі 10-12 проц. першага гатунку. З прычыны дрэннай якасьці прадукцыі фабрыка траціць дзесяткі тысяч рублёў. Толькі за 20 дзён жніўня фабрыка страціла на розьніцу гатункаў 27.000 руб.

На фабрыцы сабралося **да 3.000 няпарнага абутку.** На фабрыцы так і заяўляюць, што прадукцыя фабрыкі — **для інвалідаў**, якія маюць толькі адну нагу.

Вось коратка аб становішчы фабрыкі. За такую работу фабрыка занесена рэдакцыяй газэты «Палеская Праўда» **на чорную дошку.** Два прадпрыемствы—швэйная фабрыка «Камінтэрн» і Гомельская гарбарня ўзялі фабрыку «Праца» на грамадзкі буксір. Нядаўна на фабрыцы «Праца» быў зьменены ўвесь трыкутнік.

Але ўсе гэтыя мерапрыемствы дапамагаюць фабрыцы ўсёроўна, што мёртвамў банкі. Фабрыка «Праца» не палянше свае работы, ня ліквідуе прарывы, а наадварот з кожным днём працуе ўсё горш.

На што-ж хварэе фабрыка «Праца»? Дзе-ж прычыны яе кепскай работы?

Дзьве буйныя памылкі

Спачатку крыху гісторыі. Да мая бягучага году фабрыка працавала саматужным спосабам. Дзякуючы агульнаму ўзмацненьню пашчэ гаспадаркі і шпаркаму росту індустрыялізацыі краіны, Белскуртрэст, атрымаў магчымасьць пабудаваць новае буйное мэханізаванае абутковае прадпрыемства. У першых лічбах мая старая фабрыка ліквідавалася і ўсе рабочыя перайшлі ў новы корпус. Весь тут і былі зроблены **першыя дзьве буйныя памылкі**, у якіх вінаваты ня толькі адміністрацыя і арганізацыі фабрыкі «Праца», але і **кіраўніцтва Белскуртрэсту.**

Папершае, ня былі прыняты адпаведныя меры для перакваліфікацыі рабочых, для навучаньня іх працаваць на досыць складаных машынах. Апрача таго, з пераходам на новую фабрыку ў рады старых рабочых улілося каля **500 новых рабочых**, у большасьці саматужнікаў, якія ніколі на савецкім прадпрыемстве не працавалі і якіх не падрыхтавалі да работы на машынах. **Непадрыхтаванасьць рабочай сілы адразу-ж адбілася на рабоце машыннага цэху.** 50 проц. абсталяваньня на розных прычынах вышла з строю. Паломкі машын, прастоі — сталі звычайным зьявішчам. Машынны цэх, разьлічаны на тое, каб поўнасьцю спраўляцца з работай па далейшай апрацоўцы абутку — пасьля загатоўчага цэху, пачаў моцна адставаць ад апошняга. Загатоўчы цэх да апошняга часу выпускаў да **2.500 пар загатовак у суткі**, у той час, як нашы вачны (машынны) цэх у сярэдніх выпрацоўвае **1.200 пар у суткі.** Гэтая **няўвязка** і зьявілася асноўнай прычынай накапленьня вялікага запасу загатовак.

Падругое, пераходзячы на новую фабрыку, адміністрацыя ўвесь хлам старой фабрыкі перанесла ў новы корпус. Такім чынам новая фабрыка атрымала спадчыну **ў 17.000 пар няскончанага абутку**, што адразу ўнесла вялікую блытаніну ў работу новай фабрыкі. **І гэтая блытаніна цягнецца яшчэ па сёнешні дзень, робячы адмоўны ўплыў на выкананьне прамфінпляну.**

У гэтых памылках поўнасьцю вінавата **старое кіраўніцтва фабрыкі.** Былы дырэктар фабрыкі **Гардон** усіх запэўняў у тым, што фабрыка поўнасьцю падрыхтавана да пераходу ў новы корпус, у той час, як ня былі падрыхтаваны **ні людзі, ні машыны**, бо нават мантаж варштатаў ня быў поўнасьцю скончаны. Ня гледзячы на гэта Белскуртрэст даў сваю згоду на пераход фабрыкі ў новы корпус, таксама мусіць спадзяючыся на «авось». Самі працаўнікі Белскуртрэсту прызнаюцца, што новая фабрыка была пушчана ў ход **на адзін месяц раней вызначанага тэрміну.** Ставіцца пытаньне — чаму далі дазвол?

Бяз зьмен

Але ўся бяда ў тым, што і па сёнешні дзень ніякіх мер для ліквідацыі вынікаў гэтых памылак ня было прынята. У першую чаргу трэ' было ліквідаваць **вялікія запасы няскончанай прадукцыі**, больш увязаць работу двух асноўных цэхаў — загатовачнага і пашывачнага. **Гэтага ня было зроблена.** Адміністрацыя апраўдваецца тым, што яна гэта пытаньне пібы ставіла, але дазволу на патрэбнае скарачэньне штату загатовачнага цэху яна быццам не атрымала.

Зразумела, **не скарачэньне штату зьяўляецца выхадам з такога становішча.** Гэта значыць ісьці па лініі **найменшага супраціўленьня.** Трэба было, наадварот, — моцна ўдарыць па «вузкім месцы» фабрыкі: **наладзіць работу пашывачнага цэху, падняць яго прадукцыйнасьць.** Але адміністрацыя разам з Белскуртрэстам **аказаліся нездольнымі справіцца з гэтай задачай.**

Неўвязка ў рабоце цэхаў наглядаецца **і цяпер.** 50 проц. прастояў падаюць выключна на неўвязку ў рабоце цэхаў. Калі ёсьць загатоўкі — няма падэшвы патрэбнага разьмеру, ёсьць падэшва—няма загатовак адпаведных нумароў. Штамповачны цэх, які вырабляе падэшвы і набойкі ня ведае, які асартымэнт выпрацоўвае швэйны і загатовачны цэх. І наадварот.

Пастаноўка перакваліфікацыі рабочых **дрэнная.** Губяць каштоўны сырэц і ніхто не зважае ўвагі. Між тым, на фабрыцы **больш тэхнічнага пэрсаналу, чым на іншых абутковых фабрыках.** Частка рабочых і па сёнешні дзень атрымлівае сярэдні заработак. Таму яны з бучобай не сьпяшаюцца, «работа ня волк, у лес не ўбяжыць» — кажуць яны.

Колькасьць папомак варштату ня зьменшылася. Пры адсутнасьці патрэбнага кадру мэханікаў і запасных частак, рамонт машын значна зацягваецца. І як гэта ня дзіўна, адміністрацыя ніяк ня можа дабіцца прысылкі мэханіка, хаця-б з іншага заводу, і набыцьця належнай колькасьці запасных частак, якіх можна дастаць у Маскве.

Нагляд за работай цэхаў надзвычай дрэнны. Каштоўны сырэц, як падэшва і палувал скарыстоўваюцца, як каму хочацца. Паводле грубых падлікаў за 10 месяцаў **фабрыка перавыдатковала каля 17 тон падэшвы.** Пры рэзцы падэшвы не захоўваецца разьмер і значная частка каштоўнай падэшвы ідзе на абрэзы. З кавалку скуры, з якой можна выкраіць 6-7 падэшваў, часта выкраіваюць толькі 4 або 5.

Прадукцыйнасьць працы, у сувязі з усім гэтым, значна зьнізілася. Замест павялічэньня прадукцыйнасьці на 200 проц. (у сувязі з пераходам на мэханізаваную вытворчасьць), рабочыя працуюць **горш, чым раней**, калі працавалі саматужнымі мэтадамі: **замест 3,3 пар абутку яны выпрацоўваюць 1,42 пар абутку ў дзень на чалавека.**

Прагулы на нягрунтоўных прычынах і цякучасьць рабочай сілы дасягаюць вялізарных разьмераў. Пачынаючы з красавіка бягучага году прынята 800 рабочых, звольнена 400. І гэта пры агульным складзе рабочых у 1000 чалавек. Уліку прагулаў амаль што няма, бо ўлік гэты пастаўлены так дрэнна, што фабрыка ня ведае нават хто і колькі дзён прагуляў. Таксама няма вестак аб прастоях. Наогул бухгальтэрыя адстае на 5 месяцаў. Тлумачыцца гэта тым, што фабрыка ня мае зараз бухгальтара. Стары бухгальтар арыштаваны за шкодніцтва, а новага адміністрацыя ніяк ня можа падшукаць.

На фабрыцы наглядаецца шмат выпадкаў крадзежу. Крадуць падэшву, загатоўкі, пакралі дробнага інструманту на некалькі тысяч рублёў. Супроць гэтага ганебнага зьявішча **ні адміністрацыя, ні фабрычныя арганізацыі ніякіх мер ня прымаюць.**

Так працуе фабрыка **сёньня**, ня гледзячы на **новае** кіраўніцтва.

Ударнікі... ня лічацца

Што зрабіла новае кіраўніцтва для ліквідацыі недахопаў і мабілізацыі мас на выкананьне прамфінпляну? Зусім нічога.

Арганізаваныя раней ударныя брыгады і камуны разваліліся з-за адсутнасьці кіраўніцтва. З 1000 рабочых **ні адзін ня прымае ўдзелу ў сацспаборніцтве.** Камуністыя і камсамольцы падаюць кепскі прыклад. З 150 камуністых і 160 камсамольцаў — ні аднаго ўдарніка. Цэхавыя парт'ячэйкі не працуюць. Апошні сакратар парткалектыву **Махновіч** за 5 месяцаў сваёй работы займаўся склочніцтвам, падсіжываньнем і заціскам самакрытыкі. Бюро парткалектыву не зьвярнула ніякай увагі на пытаньне ўдзелу камуністых і камсамольцаў ва ўдарным руху і сацспаборніцтве. Партарганізацыя не рэагавала нават на самыя агідныя парушэньні працдысцыпліны з боку камуністых і камсамольцаў. Камуністыя не адстаюць ад усіх іншых рабочых у выпрацоўцы браку. Былі выпадкі звальненьня з фабрыкі камуністых і камсамольцаў, а бюро парткалектыву не рэагавала на гэтае ненармальнае зьявішча.

Член партыі **Байцэвіч** штучна затрымліваў выпрацоўку, зьніжаючы тэмпы працы, падгаварваў і іншых на тое-ж самае, каб толькі далей атрымліваць па сярэдняму заработку. Член партыі **Піменаў** увесь час вырабляе дрэнную прадукцыю, псуе каштоўны сырэц. Камсамольцы **Уменьнік і Якабсон** сыстэматычна псавалі цэлыя партыі абутку, а камсамольскі калектыў маўчаў. Член партыі майстар **Мельнікаў-рвач** па пратэкцыі прыняў на работу сваю жонку. Прадстаўнікоў «лёгкай кавалерыі», якія прышлі на фабрыку праверыць ці праведзены прамфінплян да варштату, Мельнікаў выгнаў з цэху. Камсамолец **Партон—хуліган**, вывеў са строю тры варштаты. Камсамольскі калектыў лічыць гэта зусім нармальным.

Самакрытыка ў падпольлі

Сярод асобных членаў партыі квітнеюць праваапартуністычныя настроі. Камуністыя **Златкін, Хаўкін, Бунін** часта заклікаюць рабочых паслабіць тэмпы работы. Бюро парткалектыву адносіцца да гэтага прымірэнча і цкуе актыўных рабкораў, якія выступаюць супроць правых настрояў і безгаспадарчасьці.

Сакратар парткалектыву **Махновіч**, накрыўджаны на рэдактара шматтыражкі за зьмяшчэньне правільнай заметкі аб тым, як ён пашыў сабе пару ботаў з фабрычнага тавару, пачынае цкаваць рэдактара тав. Нябецкага, абвінавачваючы яго ў правым апартуністызме, абзываючы яго вар'ятам, дыскрэдытуючы боту шматтыражкі. Начальнік «лёгкай кавалерыі» Рудзіна за тое, што ён выкрыў рад агідных фактаў, цкуюць з дапамогай сакратара парткалектыву і адмаўляюць паставіць да варштату. Ад сакратара парткалектыву не адстаюць і майстры. Майстры **Мельнікаў і Бэдэрков** цкуюць актыўнага рабкора Рудніцкага яму прышываецца абвінавачваньне псаваньні 8 пар ботаў. Сакратар камсамольскага калектыву **Рудзінскі** цкуе Рудніцкага таксама за заметку аб тым, што ён, Рудзінскі, пачыніў свой абутак з фабрычнага матар'ялу.

Райком партыі, ведаючы аб усіх гэтых агідныасьцях, не знайшоў сьмеласьці зьняць з работы сакратара парткалектыву Махновіча і паставіць пытаньні аб яго прабываньні ў радах партыі, абмежаваўся пастановай — «узмацніць парткіраўніцтва на фабрыцы «Праца накіраваўшы адказнага сакратара», Махновіча паслаў на курорт—адпачынак, пасьля «трудоў праведных».

Фабком фабрыкі зусім ніякай работы не вядзе, плянецца ў хвасьце адсталых груп рабочых, зусім не цікавіцца іх творчасьцю.

Вось малюнак партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва на фабрыцы. Ці дзіва, што фабрыка так ганебна працуе?

Горы загатовак на Гомельскай абутковай фабрыцы «Праца». Вышыня гары — што дасягае столі.

Як выратаваць фабрык

Аб фабрыцы ўжо шмат пісалі. Амаль усе газэты, нават і некаторыя маскоўскія, прыводзілі рад фактаў аб ненармальнасьцях на фабрыцы «Праца». Але справа стаіць на тым-жа месцы. У чым справа? А справа ў тым, што да гэтага часу акруговыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не аддавалі належнай увагі рабоце фабрыкі. Толькі ў апошні дні акругком партыі вылучыў «надзвычайную тройку» для разбору цэлага раду пытаньняў аб рабоце фабрыкі і пратычнай ёй дапамозе. А чаму нельга было гэтыя рашучыя меры прыняць раней, не чакаючы штуршка цэнтральных арганізацый?

Аб кіраўніцтве **ЦП саюзу гарбароў** і фабрыцы нічога не чуваць. Відавочна яго няма.

Белскураб'яднаньне баіцьць выхадзіць з дзякага становішча толькі ў тым, каб звольніць значную частку рабочых, якія заўважаны ў быстэматычных парушэньнях працдысцыпліны, прагулах, псаваньні прадукцыі і г. д., і набраць новы кадр рабочых. Нельга зразумець супарочыць супроць звальненьня шкоднікаў і злосных парушальнікаў працдысцыпліны. Але адначасова і трэба прыняць рад адміністрацыйных мер на палянпшэньні работы фабрыкі, большае увязкі цэхаў, забесьпячэньня фабрыкі патрэбнай тэхнічнай сілай, арганізацыяй тэхнічнага кантролю над работай цэхаў, падрыхтоўкай рэзэрву рабочай сілы і г. д.

Трэба неадкладна ўзмацніць партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва фабрыкі, абвясьціўшы рашучую барацьбу праваапартуністаму на практыцы. Камуністаў і камсамольцаў, якія парушаюць працдысцыпліну, прыцягнуць да партыйнай адказнасьці, ня счыняючы перад выключэньнем іх з радоў партыі.

Правай практыцы і прымірэнцтву ня павінен быць пакладзены канец.

Фабрыка, якая мае ўсе магчымасьці ня толькі выканаць прамфінплян, але і перавыканаць яго, пашыла пачаць працаваць сапраўды на-бальшавіцку. Калі дабіцца гэтага, ня трэба спыняцца нават перад самымі рашучымі мерамі.

Фалько.

„СУСТРЭЧНЫ" НА „ЭНЭРГІІ"

Ліцейшчыкі павялічваюць праграму на 500 тон

Загрузіць рабочы год поўнасьцю!

На заводзе «Энэргія» пачалася прапрацоўка прамфінпляну 1930-31 году. 28-га жніўня адбылася нарада членаў бюро цэхпарт'ячэек, цэхпрафкамітэтаў, загадчыкаў цэхамі, майстроў і рабкораў. Быў заслуханы даклад загадчыка вытворча - плянавым аддзелам тав. ЕРЫНГРОЗА аб вытворчай праграме будучага году.

Спрэчкі пачаліся з паказаньняў асобных таварышоў на буйныя памылкі праграмы, з паказаньнем на тое, што плянавы аддзел ня ўлічыў раду момантаў.

— Плян работы ЛІЦЕЙНАГА ЦЭХУ, —заявілі загадчык ліцейным цэхам тав. ПІОТУХ і ліцейшчык тав. ХАЛАДЗІНСКІ, — не намячае для ліцейнага цэху поўнай нагрузкі і ня ўлічвае яго прапускной здольнасьці. Мы павінны ўзяць на сябе яшчэ 800 камплектаў запасных частак да камнядрабілак, што павялічыць загрузку яшчэ на 500 тон, прычым гэта не патрабуе дадатковай кваліфікаванай сілы. Але мы патрабуем, каб у тэрміновым парадку пабудаваць сушню для шышальнай, адрамантаваць старое абсталяваньне і прыстасаваць яшчэ адзін пад'ёмны кран.

Прадстаўнікі кацельнага цэху т. т. Сальнікаў і Андронаў патрабавалі для выкананьня праграмы тэрмінова закончыць пабудову кацельнага цэху і набыць яшчэ адзін прэс-ножніцы для рэзкі ліставога жалезэ.

Асабліва шмат спрэчак выклікала праграма ПА МЭХАНІЧНЫМ ЦЭХУ. Плянавы аддзел так склаў гэтую праграму, што частка абсталяваньня ня была-б скарыстана. І гэта ў той час, калі заводу для выкананьня прамфінпляну будучага году, якая ў два разы больш праграмы бягучага году, не хапае варштата - гадзін.

Плян прадугледжваў скарыстаньне абсталяваньня з разьліку 278 дзён на працягу году, у той час, як можна давесьці колькасьць рабочых дзён да 348.

Намесьнік дырэктара тав. Айзман, т. т. Няронскі, Гнядко і інш. у сваіх выступленьнях прапанавалі ПЕРАГЛЯДЗЕЦЬ ПРАГРАМУ ПА МЭХАНІЧНЫМ ЦЭХУ І ПАБУДАВАЦЬ ЯЕ ТАК, КАБ ВЫХОДЗІЦЬ З РАЗЬЛІКУ 348 РАБОЧЫХ ДЗЁН. Але і ў гэтым выпадку заводу ня хопіць каля 100 кваліфікаваных такароў. Тому нарада выказалася за тое, каб патрабаваць ад Наркампрацы і Мэталяаб'яднаньня падрыхтоўкі праз ЦІП 40 такароў. Апрача таго трэба неадкладна ўзяцца за падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых на самім заводзе.

Шмат увагі нарада зьвярнула выкананьню рабочых прапаноў. Тав. Айзман абяцаў, што адміністрацыя ня будзе нянчыцца з тымі, хто ня выконвае рабочых прапаноў. Такія меры ўжо трэба прыняць у адносінах тэхнічнага дырэктара інжынэра Шлапакова, які ня выканаў загаду адміністрацыі аб праверцы выкананьня рабочых прапаноў.

Востра стаіць пытаньне аб забесьпячэньні заводу стальным ліцьцём. Заказ на стальное ліцьцё, як быццам дадзены заводу імя 1-га мая. Але вось на пытаньне аб гэтым, загадчык забесьпячэньня Мэталяаб'яднаньня тав. Брускін адказаў: «заказ дадзены заводу 1-га мая, АЛЕ ДЗЕ ЁН ЗНАХОДЗІЦЦА, Я НЯ ВЕДАЮ». Рабочыя патрабуюць ад Мэталяаб'яднаньня выразнага адказу наконт становішча з забесьпячэньнем заводу стальным ліцьцём.

Майстар мэханічнага цэху т. Паўлоўскі прапанаваў для палянпшэньня якасьці прадукцыі ПРЫМАЦАВАЦЬ РАБОЧЫХ ДА МАШЫН.

З 2 верасьня прамфінплян 30-31 году пачынае прапрацоўвацца ПА БРЫГАДАХ паводле прынцыпу СКРАЗНЫХ БРЫГАД. Да кожнай брыгады прымацоўваюцца адказныя партработнікі, тэхнічны пэрсанал і плянавік.

1 верасьня адбудзецца вытворчы вечар, прысьвечаны абгаварэньню прамфінпляну будучага году.

2 верасьня брыгада гравія - сартовак абмяркоўвае свой прамфінплян. Яна мае заданьне даць 700 гарвія-сартовак. Брыгада павінна пасьледваць прыкладу ліцейшчыкаў і высунуць свой сустрэчны прамфінплян.

ПАЛІЧАНСКІ.

Сталінцы адказваюць сталінцам

Мы ўключаемся ў конкурс на лепшае прадпрыемства

Усе сілы і энэргію на выкананьне пяцігодкі за 4 гады

Мы, рабочыя друкарні імя Сталіна, абмеркаваўшы на мітынгу адозву ленінградзкіх рабочых заводу імя Сталіна аб арганізацыі вытворчага конкурсу на лепшае прадпрыемства, цалкам далучаемся да гэтай адозвы, як аднаго з лепшых мэтадаў выкананьня дырэктыў XVI зьезду партыі.

**Наша прадпрыемства за 9 месяцаў другога году пяцігодкі па асноўных паказьніках перавыканала прамфінплян (на 6 проц. па выпуску прадукцыі і на 2 проц. па прадукцыйнасьці працы). Сацспаборніцтва п

Новы закон аб самаабкладаньні

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Рэканструкцыя сельскае гаспадаркі, перабудова яе на новых сацыялістычных пачатках і зьвязаны з гэтым агульны культурна-гаспадарчы ўздым калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас в кожным годам патрабуе ўсё больш сродкаў на задавальненьне іх культурна-гаспадарчых патрэб. Побач са штогадовым павялічэньнем сродкаў, якія адпускаюцца дзяржаваю на гэтыя мэты, трэба скарыстаць ініцыятыву і сродкі самога насельніцтва. Таму асаблівае значэньне набывае самаабкладаньне насельніцтва на правядзеньне розных культурна-гаспадарчых мерапрыемстваў.

Зыходзячы з гэтага, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР, на падставе пастановы ЦВК і СНК СССР за 16 жніўня 1930 г. пра самаабкладаньне насельніцтва (газ. «Известия ЦИК СССР и ЦИК РСФСР» за 19 жніўня 1930 г. № 228) пастанаўляюць:

1. Устанавіць наступны пералік культурных і гаспадарчых мерапрыемстваў, на якія дазваляецца прыняць самаабкладаньне:

а) на арганізацыю, утрыманьне і абслугоўваньне (будаваньне новых, пабудову няскончаных, пашырэньне, найманьне, капітальны і бягучы рамонт будынкаў, абсталяваньне, апал і асьвятленьне) гаспадарчых, культурна-асьветных і санітарных устаноў мясцовага грамадзкага значэньня, школ, хат - чытальняў, клюбаў, чырвоных куткоў, дзіцячых дамоў, ясьляй і пляцовак, больніц, доктарскіх, фельчарскіх, вэтэрынарных і агранамічных пунктаў, дамоў для інвалідаў і для састарэлых, лазьняў і хлебазапасных магазынаў;

б) на правядзеньне новых, утрыманьне і рамонт існуючых дарог, мастоў, грэбляў, перапраў і перавозаў, што маюць мясцовае сельскае грамадзкае значэньне;

в) на ўпарадкаваньне населішчаў: капаньне і ўтрыманьне ў парадку студняў, грамадзкіх саджалак, пляцоў на магільніках для здохлай жывёлы, плошчаў грамадзкага карыстаньня (выгнаў, лугоў), а таксама на ўтрыманьне палявых вартаўнікоў;

г) на супрацьпажарныя мерапрыемствы: будаваньне, капітальны і бягучы рамонт і гаспадарчае ўтрыманьне пажарных дэпо і хлявоў, на набыцьцё і ўтрыманьне супрацьпажарных машын і прыладаў, на ўтрыманьне пажарных вартаўнікоў;

д) на правядзеньне лесакультурных работ у лясох мясцовага значэньня, на дрэванасджэньне на шляхох мясцовага значэньня, на зялёныя насджэньні вакол грамадзкіх будынкаў;

е) на набыцьцё і рамонт сельска-гаспадарчых машын, на набыцьцё і ўтрыманьне заводзкай жывёлы грамадзкага карыстаньня.

2. Пры расклады самаабкладаньня кіравацца наступным:

а) на гаспадаркі, вызваленыя цалкам ад сельска-гаспадарчага падатку па малазаможнасьці, самаабкладаньне налічваецца зыходзячы з 2-х рублёў акладу падатку;

б) на гаспадаркі, вызваленыя цалкам ад сельска-гаспадарчага падатку па іншых ільготах, самаабкладаньне налічваецца, зыходзячы з палавінных налічаных на іх акладаў сельска-гаспадарчага падатку;

в) рабочыя і служачыя, крыніцай існаваньня якіх зьяўляецца выключна заработная плата, ня прыцягваюцца да самаабкладаньня;

г) рэшце катэгорый насельніцтва самаабкладаньне павялічваецца ў парадку паказаным у арт. 12 пастановы ЦВК і СНК СССР.

Агульны сход грамадзян данага населішча, а таксама пленум сельскіх і местачковых саветаў маюць права ня прыцягваць да самаабкладаньня гаспадаркі, пералічаныя ў п. п. «а» і «б» гэтага артыкулу, а таксама гаспадаркі вайскоўцаў, якія знаходзяцца ў радох РСЧА, інвалідаў працы і вайны і чырвоных партызан.

3. Памер самаабкладаньня па даным населішчу ў цэлым на працягу году ня можа быць больш 50 проц. агульнай сумы сельска-гаспадарчага падатку, якая належыць да выплаты па працягу году з аднаасобных гаспадарак данага населішча, разам з сумай, якая належала-б з грамадзян, якія плоцяць падаходны падатак і вызваленых ад яго, паводле неабкладанага мінімуму, калі-б гэтыя платнікі абкладаліся сельска-гаспадарчым падаткам.

Калі для ажыцьцяўленьня вызначаных мерапрыемстваў паказаны памер самаабкладаньня нявыстарчальны, агульны сход грамадзян можа ўстанавіць памер самаабкладаньня ў межах да 100 проц. паказанай вышэй сумы падатку. Гэткае павышэньне самаабкладаньня патрабуе асобнага зацьверджаньня раённага выканаўчага камітэту.

4. Устанавіць, што самаабкладаньне праводзіцца:

а) ва ўсіх сельскіх мясцовасьцях;

б) мястэчак і

в) сельскіх населішчах, якія знаходзяцца ў межах гарадоў;

5. Агульны нагляд за вядзеньнем самаабкладаньня ўскладаецца на раённыя выканаўчыя камітэты, якія павінны складаць раённыя планы правядзеньня самаабкладаньня. Нагляд за будаўніцтвам, якое праводзіцца за сродкі самаабкладаньня, ускласьці на раённыя выканаўчыя камітэты. Народным камісарыятам — Асьветы, Аховы Здароўя, Зямляробства, унутраных спраў і Белдартрансу рабіць патрэбную тэхнічную дапамогу будаўніцтву, якое праводзіцца на сродкі самаабкладаньня, а таксама ўжыць патрэбныя захады для забесьпячэньня гэтага будаўніцтва патрэбнымі будаўнічымі матар'ялямі, у прыватнасьці ўключыць у свой плян забесьпячэньне дэфіцытнымі матар'ялямі будаўніцтва за сродкі самаабкладаньня.

6. Агульны падлік памеру і паступленьня самаабкладаньня, арганізуецца Народным Камісарыятам Фінансаў.

7. Для поўнага пасьпяховага выкананьня самаабкладаньня сельскія саветы павінны забясьпечыць актыўны ўдзел у растлумачальнай рабоце па самаабкладаньні батрацтва, беднаты, калгасьнікаў і грамадзкасьць вёскі.

Самаабкладаньне павінна праводзіцца выключна па добраахвотных пачатках. Ужываньне адміністрацыйнага націску на насельніцтва — сурова забараняецца.

8. Абавязаць РВК і сельсаветы, а таксама належныя рэвізійныя камісіі ўстанавіць строгі кантроль над тым, каб сродкі па самаабкладаньні насельніцтва выдаткоўваліся своячасова і выключна на мэты, вызначаныя сходамі.

9. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў выдаць інструкцыю па дастасаваньні гэтае пастановы.

10. Скасаваць: пастанову ЦВК і СНК БССР за 12 верасьня 1929 г. «пра самаабкладаньне насельніцтва» (З. З. 1929 г. № 31, паст. 184), пастанову ЦВК і СНК БССР за 17 сьнежня 1929 г. «пра зьмену п. «ж» арт. II пастановы «пра самаабкладаньне насельніцтва» (З. З. 1929 г. № 45, паст. 27).

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Нам. старшыні СНК К. БЭНЭК.
Сакратар ЦВК А. ХАЦКЕВІЧ.

Перапынка, ці бесьперапынка

ПЛАДЫ АПАРТУНІЗМУ І КАНЦЫЛЯРСКАЙ ІНЭРТНАСЬЦІ

Аб народна - гаспадарчым значэньні ўвядзеньня бесьперапыннага тыдню ня прыходзіцца даводзіць.

Разам з сямігадзінным рабочым днём — бесьперапынка ў вытворчасьці зьявілася магутным фактарам паскарэньня тэмпаў індустрыялізацыі краіны і рэвалюцыйнай ломкі бытавога ўкладу працоўных мас.

Ня менш важнае значэньне мае бесьперапынны тыдзень у барацьбы з бюракратызмам і цяганінай. Бесьперапынка дае магчымасьць наблізіць работу апарату да шырокіх мас працоўных, умацніць рабочы кантроль, паскорыць тэмп работы апарату і значна палепшыць абслугоўваньне усіх галін народнае гаспадаркі і працоўнага насельніцтва краіны.

Але, на жаль, ня ўсюды добра зразумелі палітычнае значэньне бесьперапыннага тыдню, і шмат у якіх установах пытаньне пераводу на бесьперапынку ня было належным чынам прапрацавана і падрыхтавана. У працэсе работы ня было прынята мер да зьнішчэньня недахопаў ні з боку адміністрацыі ўстаноў, ні з боку грамадзкіх арганізацый, што асабліва вызьвілася ў няўмэньні арганізаваць намесьніцтва (замену) супрацоўнікаў у іх выхадныя дні.

У выніку ўсяго гэтага, пры адсутнасьці належнай увагі з боку органаў працы і прафсаюзных арганізацый, у некаторых установах нагадваецца рад адмоўных момантаў у працы, што дыскрэдытуе ідэю бесьперапынкі і дае повад для гутарак аб няпрыгоднасьці бесьперапынкі для савецкага апарату. Адміністрацыя і грамадзкасьць некаторых устаноў замест таго, каб змагацца з гэтымі апартуністычнымі настроямі, пайшлі на лінію найменшага супраціўленьня, на лінію адмаўленьня ад бесьперапынкі і пераходу на перапынны тыдзень.

«Піянэрамі» ў гэтай справе ў БССР зьявіліся **кантора Дзяржбанку і Белпайгандлю**, апошні нават без дазволу адпаведных устаноў.

«Добры» прыклад, як кажуць, «заразьлівы» і ўсьлед за гэтымі установамі падалі хадайніцтвы аб пераходзе на бесьперапынны тыдзень і рад іншых устаноў, як кантора Саюзкалгасбанку, Белкамунбанк, Белдзяржгандлю і інш.

Матывы, прыведзеныя ў гэтых хадайніцтвах, яскрава сьведчаць аб беспадстаўнасьці і неабгрунтаванасьці жаданьня пераходу на перапынны тыдзень.

Банкі, апроч довадаў абатым, што яны ня зьвязаны з абслугоўваньнем прадпрыемстваў і працоўнага насельніцтва, прыводзяць яшчэ наступныя матывы:

Белкантора Саюзкалгасбанку піша:

«...У рабоце апарату адчувасцца ня ўвязка, бо тыя ці іншыя працаўнікі з-за адсутнасьці якога-небудзь, на выпадку выхадного дня, адказнага працаўніка, ня могуць у гэты-ж дзень зрабіць тую, ці іншую тэрміновую работу, па-колькі яна патрабуе прапрацоўкі, калі-ж зьяўляецца той працаўнік, ён, бываючы часта выпадкі, ня можа таксама вырашыць пытаньне, бо затрымаў выхадны дзень другі працаўнік, з якім ён у сваёй працы цесна зьвязаны...»

Кіраўнікі самі тут расьпісваюцца ў сваёй нездольнасьці арганізаваць працу апарату пры бесьперапынцы. Калі-б былі выкананы пастановы Урадавай Камісіі па бесьперапынцы, дык не здарылася-б таго, што два працаўнікі, «цесна зьвязаныя ў сваёй рабоце», ніяк ня могуць спаткацца ва ўстанове, каб вырашыць «тэрміновую работу, якая патрабуе прапрацоўкі».

Довады Белкамунбанку нямногім адрозьніваюцца ад довадаў Белгасбанку. У сваім хадайніцтве, падмацаваным подпісамі старшыні мясцкому і старшыні эканомкамісіі, Белкамунбанк піша, што «ў зьвязку з чысткай апарату і па асабістых прычынах зволена 16 чалавек і замест 50-ці супрацоўнікаў засталося — 34, а работа Банку ня зьменшылася, пры чым надышоўшая адпускная кампанія яшчэ больш пагоршыла справу, пазбавіла магчымасьці супрацоўнікам своячасова найсьці ў годнуск, а на Біржы Працы людзей няма для замены».

Вось у чым справа, нельга своячасова найсьці ў водпуск, а таму — далоў бесьперапынку!

Вельмі характэрным зьяўляецца прыклад Белпайгандлю, які перайшоў на перапынку без узгадненьня з адпаведнымі органамі і нават не абмеркаваўшы гэта пытаньне з грамадзкасьцю. Пры чым, ня гледзячы на пераход на «спасительную» перапынку, наўвязкі ў працы ня спыніліся і адміністрацыя вымушана была аддаць некалькі загадаў, накіраваных супроць парушэньняў працоўнай дысцыпліны.

У заключэньне, неабходна заўважыць, што як у Дзяржбанку, гэтак і Белпайгандлю фактычна ўведзена не перапынка ў чыстым выглядзе, а нагромашанага віду бесьперапынка, бо ў агульныя выхадныя дні ва ўстанове пакідаюцца дзяжурныя, якія павінны выконваць усю бягучую неадкладную працу.

Усе гэтыя недахопы ў правядзеньні бесьперапыннага тыдню, выкліканыя бюракратычным падыходам да гэтай справы, прымушаюць біць трывогу.

Гэтыя тэндэнцыі і настроі вырастаюць з права - апартуністычнай недацэнкі ролі бесьперапынкі ў справе паскарэньня тэмпаў індустрыялізацыі краіны.

Гэтым апартуністычным тэндэнцыям трэба даць жорсткі бальшавіцкі адпор.

Н. ПЕРШАМАЙСКІ.

МЕНСК

Скончана следзтва па справе МЦРК

Скончана следзтва па справе работнікаў МЦРК і Белкаапсаюзу. К суду прыцягваюцца за шкодніцтва — **Бужын і Бярозкін** (ЦРК); за халатнасьць — **Юдовіч** (МЦРК), **Гардзін** (БКС).

Справа будзе разглядацца Вярхоўным Судом БССР.

Раённыя камітэты саюзу Сельгаслесрабочых

Прэзыдыум Беларускага Рэспубліканскага Камітэту Сельгаслесрабочых пастанавіў арганізаваць ва ўсіх раёнах раённыя камітэты саюзу. На усіх акругах ужо праведзены спэцыяльныя нарады раённых інструктароў па практычным правядзеньні ў жыцьцё гэтай пастановы. На мясцох праводзяцца раённыя нарады прафактыву і правядзячыя сходы батрацтва і сельгаслесрабочых.

Рэарганізацыя калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы ў раёне

Усім райкалгассаюзам і райсаюзам сельска-гаспадарчай каапэрацыі

У дадатак да інструкцыі Белкалгасцэнтру аб рэарганізацыі калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы раёну, паведамляем рашэньні Цэнтральнай камісіі для кіраўніцтва і выкананьня.

Пры арганізацыі калгаспага саюзу ў раёне — яму перадаецца агра-вытворчы пэрсанал для абслугоўваньня калгасаў, «дваццаці пяці тысячнікі», сума сродкаў на ўтрыманьне апарату калгаснага саюзу да кастрычніка месяца, членскія ўзносы калгасаў, фонды калектывізацыі батрацтва і беднаты, фонды вытворчага і культурна-бытавога абслугоўваньня, адпаведная доля агульных і агранамічных фондаў.

Страты і абавязацельствы існуючых Райсаюзаў калгасным саюзам не пераходзяць.

У раёнах, дзе калгассаюзы не арганізуюцца, стваравацца аўтаномныя калгасныя сэкцыі пры Райкаапсаюзе. Яны непасрэдна зьвязаны з цэнтральным калгасным саюзам і знаходзяцца пад яго кіраўніцтвам.

Для кіраўніцтва арганізаванымі саюзамі, паводле ўмовы з кіруючымі органамі — зацьвярджаецца часовае праўленьне.

Праўленьне Белкалгасцэнтру.

Хроніка выстаўкі

— За першыя дзьве дзесяціднёўкі работы ўсебеларускае выстаўкі праз яе павільёны прайшло каля 90.000 экскурсантаў — рабочых, калгасьнікаў, сялян - індывідуальнікаў і чырвонаармейцаў.

— 28 жніўня выстаўку аглядаў старшыня ЦВК тав. **А. Г. Чарвякоў.**

— Пазаўчора выстаўку паведаў амэрыканскі спэцыяліст — жывёлавод **Х. С. Брэчэр.** У павільёне сьвінагадоўлі ў кнізе ўражаньняў экскурсантаў п. Брэчэр запісаў:

«Сьвіней, якіх я бачыў на гэтай выстаўцы, не памяняю на лепшых сьвіней, што разводзяць амэрыканскія фэрмэры».

— Сёньня і заўтра на сцэне тэатру выстаўкі, у канцэрце выступаюць экскурсанты - выхаванцы бабруйскае школы для няпоўнагодніх злачынцаў. Хор бала лаечнікаў школы выканае беларускія і расійскія народныя сьпевы.

— Пасьлязаўтра ў павільён рэспубліканскай прамысловасьці прыбывае з Масквы камбайн.

— Шмат якія сяляне — бедняки і серадняки адзінаасобнікі — пабываўшы на выстаўцы, уступаюць у калгасы. Гэтаму руху прысьвечаны апошнія нумары выставачнае газэты «Сацыялістычная рэканструкцыя».

Сельская гаспадарка ў прыгараднай мяжы

Менскі Гарадзкі Савет пастанавіў прыдаць сельскай гаспадарцы прыгараднай мяжы гародна - садова - малочны напрамак. Прыгарадны раён будзе разьбіт на дзьве зоны: першая зона — ў адлегласьці 2-3 клм. ад гораду — адводзіцца пад высока-інтэнсыўныя формы гароднінтва; у ёй будуць разьведзены парніковая гаспадарка, раньнія культуры гароднины, аднагадовыя кармавыя травы. У другой зоне, апроч гародніх культур, будуць разьведзены кармавыя кораньплоды, сіласныя культуры і садовыя расьліны.

Асоавіяхім--да манэўраў

— Цэнтральны Савет Асоавіяхіму высылае на манэўры агітацыйны аўтамабіль для культурнага абслугоўваньня вёзьнікаў манэўраў і насельніцтва. У аўтамабілі будзе знаходзіцца радыё, кіно-перасоўка і шмат ваеннай літаратуры.

***

Да надыходзячых манэўраў Цэнтральны Савет Асоавіяхіму вылучае атрад лепшых асоавіяхімаўцаў, які прыме ўдзел у манэўрах.

ЗА ДЗЕНЬ

— У Гомельскай акрузе адчыняюцца **тры сельска-гаспадарчыя прафшколы**, на якія будзе прынята сто чалавек.

— На сёньнішні дзень **у Пэдфак** пададзена 683 заявы, з іх 115 ад рабочых і дзяцей рабочых і 36 — ад калгасьнікаў.

— 1-га верасьня склікаецца **пленум ЦК сельгасрабочых.**

— Гарадзкая Інспэктура Наркамасьветы сумесна з таварыствам «Прэч Няпісьменнасьць» арганізуе «трохмесячнік паходу за пісьменнасьць». Месячнік пачнецца 1-га верасьня. Менск будзе разьбіты на пяць вучасткаў, пры якіх будуць арганізаваны штабы.

— 1-га верасьня адбудзецца выпуск 6-месячных курсаў кіно-мэханікаў. Курсы скончылі 70 чал.

***

— Скончыўся набор кандыдатаў у Маскоўскі Інстытут Кінематографіі, у Ленінградзкія кіно-прафшколы і фотакіно-тэхнікум. У Маскоўскі Інстытут Кінематаграфіі ад БССР пасланa 22 чал., у Кіно-прафшколу—20 чал., і ў Ленінградзкі фота-кіно-тэхнікум—10 чал.

***

— ЦСПСБ паслаў 20 рабочых у Белкаапсаюз для дапамогі загатоўкам гароднины і хлеба.

***

— Для абслугоўваньня рабочых «25-ці тысячнікаў» пры ЦСПСБ арганізуецца Кансультацыйнае Бюро.

***

— ЦС Асоавіяхіму адчыняе курсы па падрыхтоўцы сакратароў райсаветаў і арганізатараў вайсковых гурткоў.

***

— 30-га жніўня адчыняецца 1-шая Ўсебеларуская нарада па вышэйшай педагагічнай асьвеце.

СЬПІСЬ

дакладчыкаў па правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў:

Да чыгункі: т. т. Вішнеўская, Ліберман, Пыжыкаў (Белсадсаюз); Масевіч (Радыё-Цэнтр), Шаліма, Мандрыка, Губская (ДПУ), Путырская. **Да зав. «Энэргія»:** т. Сапун. **Да зав. «Бальшавік».** Багарад (БМЖС), Сякерская (БДУ), Мар'ясіна (НКЮ). **Да ф-кі імя «Крупскай»:** Кірніс (Белкалгасцэнтр), Усьмінская (Чырвоны Крыж), Варонін (НКФ), Сланімская, Брайніна (ЦРД); **шчотачн. ф-кі:** Аляксеева (РК КП(б)Б), Гуцанкова (Белкаапсаюз), Іофэ. **Да гуты «Пралетары»:** Вільковуй, Лінг, Пракоф'ева і Бурава. **Да «Чырвонай Зоркі»:** Левіна. **Да сьпіртзаводу:** Эрэнбург; **Белсампрамсаюзу:** Бэр (Рабфак), Любінская (БКС), Сулькіна (БКС). **Абутковай ф-кі:** Готліб, Палякоўскі, Нікольская (БКС), Плоткіна. **Да хэмфармзаводу:** Гінзбург (БКС); **Лямцавай ф-кі:** Залатарова (НКЮ). **Шчацінай ф-кі:** Портная (Нэрв. Клініка). **Да малочнага заводу:** Вялікая (ЦРК). **Пас. «Камінтэрн»:** Кейлін (ВСНГ) Нікалаеў (ЦКК РСІ), Адамчук (БКС), Хацкевіч (Бел. Раб. і Сялянка).

Т. т. Слаўковіч (Ашчадкаса); Нікольскі (НКЮ), Глезер (БКС), Давідовіч (ЦРД), Альперовіч (ЦРК), Цэнцыпер (НК Аховы Здароўя), Галаскок, Філатаў, Крэсік (Банкаўск. установы), Вішнеўскі, Гутман (Белпайгандлсаюз), Дубравіцкі, Беразоўская (Яўпэдтэхнікум), Хэйфэц (яч. ВНУ), Лахман (Рабфак), зьяўляюцца рэзэрвовымі дакладчыкамі.

Аб часе дакладаў і месцы дакладчыкам трэба дагаварыцца з сакратарамі ячэек.

З лістоў рабселькораў

ХОПІЦЬ РАЗВАЖАНЬНЯЎ

Дырэктывы партыі і ўраду ў галіне сіласаваньня па **Пухавіцкім раёне** выконваюцца надзвычайна марудна з тае прычын, што арганізацыі, якім даручана справа сіласаваньня, бязьдзейнічаюць. З прадугледжанай па плану пабудовы 24 сіласных ям і 3-х вежаў, на сёньнішні дзень прыступлена да будаўніцтва 13-ці сіласных ям і адной вежы. **Пухавіцкі РВК і Райпаляводсаюз** не прынялі ніякіх мер да забесьпячэньня будаўніцтва патрэбнымі матар'ялямі. У выніку гэтага зараз адчуваецца недахоп патрэбнага матар'ялу, як цамэнту і г. д., з прычыны чаго і затрымліваецца будаўніцтва сіласных ям і вежаў.

Асабліва дрэнна абстаіць справа з сіласным будаўніцтвам у **Шацкім кусьце.** Там з прадугледжаных плянаў — пабудаваць 5 сіласных ям, зусім не распачалі будаўніцтва піводнас ямы.

Камсамол **Пухавіцкага** раёну мабілізаваў для гэтае работы 16 камсамольскіх брыгад, але адпаведныя арганізацыі ім не аказваюць ніякае дапамогі ў рабоце. РВК і Райпаляводсаюз лічаць, што сіласнае будаўніцтва — справа камсамольская арганізацыі, а патэтаму яны займаюцца разважаньнямі і ня сочаць за практычным выкананьнем дырэктыў.

Такія адносіны да сіласнага будаўніцтва ставяць пад пагрозу зрыву плянавыя меркаваньні. Пухавіцкі РВК і Райпаляводсаюз павінны дабіцца рашучага пералому ў гэтай справе.

Дрозд.

ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ НЕ ПАДРЫХТАВАНЫ

У **Засінцаўскім сельсавеце, Каралінскага раёну,** да навучальнага году не падрыхтаваны. У сельсавеце маюцца тры школы, якія неабходна рамантаваць. Між тым сельсавет зусім не клапаціўся аб рамонце школ і да гэтага часу яны яшчэ не адрамантаваны. У гэтым годзе адчуваецца яшчэ адна школа. Прызначаны будынак для школ амаль што разбураны, цечы разьбіты, адсутнічае абсталяваньне школы і г. д. Таксама дрэнна і з укамплектаваньнем школ настаўнікамі. На сёньнішні дзень адсутнічае патрэбная колькасьць настаўнікаў.

Пастановы ўраду аб усеагульным навучаньні не папулярызаваны сярод насельніцтва с-с. Усё гэта ставіць пад пагрозай сваячасовы пачатак навучальнага году.

Дзядзька Клім.

НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ СЯРОД ДАПРЫЗЫЎНІКАЎ НЯ ЛІКВІДУЕЦЦА

У **Дукорскім** с-с, **Сьмілавіцкага раёну,** налічваецца каля 30 няпісьменных дапрызыўнікоў. Справай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікоў ніхто не займаецца, а с-с нават і ня думае заняцца.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі сельсавету да гэтай справы адносяцца нядбайна. Раённы Вайсковы Аддзел нават і ня ведае, што ў гэтым с-с маюцца няпісьменныя дапрызыўнікі.

Ц. Лявіцкі.

БРК РЗЛ—ЗАСТУПІСЯ ЗА БАТРАЧКУ

На працягу доўгага часу **Міньско Дзейян** (Высоцкі сельсавет, Аршанскага раёну) зьдзекуецца над батрачкай, а саюз СГЛР ня крыпуе ніякіх мер да абароны батрачкі. Нават догавару з гэтай батрачкай не заключылі, з прычыны чаго яна працуе амаль што круглыя суткі. Днём пасе жароў, пад вечар убірае ўраджай у Міньско, а ўночы возіцца з яго дзецьмі. Мала гэтага. Яна ходзіць абарванай, а зачастую — і галоднай. БРК РЗЛ павінен тэрмінова расьсьледаваць гэтую справу і дапамагчы батрачцы.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Дом Камасьветы. 30 жніўня а 8 гадзіне ўвечары — лекцыя для партыйнага і камсамольскага актыву на тэму: «Навейшыя дасягненьні у хэміі». Пасьля лекцыі мастацкае аддзяленьне. Білеты — па РК КП(б)Б.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б склікае 1-га верасьня, а 7 гадзіне ўвечары, ў клюбе імя Леніна (пасажырскі вакзал) нараду сакратароў ячэек, арганізатараў сэктараў партвучобы і сэктараў масавай працы, жаноргаў, старшынь ФЗМК-партыйцаў. Парадак дня: 1. Аб сетцы масавай партасьветы на 1930-31 навуч. год; 2. Аб ходзе прапрацоўкі рашэньняў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б; 3. Аб правядзеньня 3-х месячніку культпаходу «За пісьменнасьць»; 4. Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў; 5. Аб ходзе падпіскі на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады».

Яўка вышэйпаказаных т. т. абавязкова.

БДУ. 30 жніўня, а 14 гадзіне дню склікаецца бюро яч. КП(б)Б факультэту Савецкага Будаўніцтва і Права, разам з фракцыяй КП(б)Б прафкому па пытаньні аб пачатку навучальнага году. Яўка ўсіх членаў бюро і фракцыі прафкому, а таксама членаў яч. — абавязкова.

Бюро ячэйкі.

Рабфак БДУ. Пачатак заняткаў на 1-шым курсе Рабфаку БДУ 1-га кастрычніка. На астатніх курсах — 1-га верасьня. Прыём на беларускае аддзяленьне — скончаны; на яўрэйскае і польскае аддзяленьні — прымаюцца заявы да 5-га верасьня. Пачатак іспытаў — 10 верасьня.

Дэканат.

БДУ. 31 жніўня, а 10 гадзіне раніцы ў аўдыторыі № 20 (Прыродазнаўчы корпус) адбудзецца нарада партыйна-камсамольска-прафэсыйнага актыву факультэту Народнае Гаспадаркі па наступных пытаньнях: 1. Падрыхтоўка да навучальнага году; 2. Аб ударництве; 3. Аб пазыцы «Пяцігодка — за чатыры гады».

— З 29 жніўня да 1 верасьня ад 7 да 9 гадз. увечары ў **Доме Асьветы** будзе адбывацца рэгістрацыя членаў і кандыдатаў партыі калектыву КП(б)Б Працасьветы, якія знаходзяцца на вучобе, а таксама ўсіх іншых, з паказаньнем дзе і хто жадае займацца.

— **БДУ.** Заняткі на ўсіх курсах **факультэту савецкага будаўніцтва і права** (апроч першага) пачынаюцца з 1 верасьня. З гэтае прычыны дэканатам склікаецца нарада ўсіх навуковых працаўнікоў факультэту 30 жніўня а 13 гадз. дню ў канцылярыі факультэту (хэмічны корпус). Яўка абавязкова.

— 30 жніўня а 6 гадз. увечары адбудзецца нарада ўсіх выкладчыкаў факультэту народнае гаспадаркі БДУ у памяшканьні дэканату (Універсытэцкі гарадок). Яўка абавязкова.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара **А. МІТЛІН.**

Фрунзаўскі і Кастрычніцкі РК ЛКСМБ, рэдакцыя газ. «Чырвоная Зьмена» сумесна з Беларускім Штабам «У ПАХОД ЗА ПАПЕРУ»

скліка юць

СЕНЬНЯ, а 7 г. веч. у памяшканьні рэдакц. газ. «Зьвязда» (Савец., 63)

ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ

сакратароў ячэек ЛКСМБ, зажатых піянэр-атрадаў, старшынь фарпостаў па пытаньні

паходу за паперай і месячніку збору макулятуры.

ПРОСЬБА ЗЬЯВІЦЦА СВАЯЧАСОВА.

Фрунз. і Кастр. РК ЛКСМБ.
Мас. аддз. рэд. газ. «Чырв. Зьмена».
Белзрупкі Штаб «У паход за паперу».

31-га ЖНІЎНЯ А 8 ГАДЗ. ВЕЧ. У КЛЮБЕ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ АДБУДЗЕЦЦА

працяг аб'яднанага сходу рабочых абутковай фабрыкі сумесна з работнікамі МЦРК

па пытаньні АБ СТАНЕ І ДАЛЕЙШЫХ ПЭРСПЭКТЫВАХ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ПРАЦОЎНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ГАРОДНІНАЙ І ЎЗЬНЯЦЬЦЯ МЦРК НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР.

На сход запрашаюцца прадстаўнікі Наркамгандлю, Наркамзёста, НК РСІ, гандлёвай секцыі Гарсавету, брыгада УсеЦСПС і Цэнтрасаюзу, прадстаўнікі ад рэдакцый газэт і рабочыя спажыўцы.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

30, 31 жніўня, 1, 2 верасьня

„АВАНГАРД" п'еса ў 4-х дзеях. В. Катаеў.

Пастаноўка С. Рэзанава і К. Саньнікава. Мастак Ю. Гольц. Музыка В. Сакалова. Кіраўнік хору М. Кауфман. Пеказ вядзе С. Калпашнікаў.

Пачатак роўна а 8 г. 30 м. | Білеты прадаюцца ў касе тэатру, у рабочай касе і на Ўсебеларускай выстаўцы.

У панядзелак, 1-га верасьня

АДЧЫНЕНЬНЕ

дзіцячага кіно-тэатру

„ЮНЫ ПІЯНЭР"

На экране новая карціна вытворчасьці «Саюзкіно»

„САПРАЎДНЫЯ ПАЛЯУНІЧЫЯ"

Кіно-тэатр „Культура"
Гэраічная аповесьць з гісторыі Чэчні
ЗЭЛІМ ХАН
у 6 частках.
Вытворчасьці «Усход-кіно»
Пачатак сэансаў: а 7 г., 9 г., 10 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал
Новая вясёлая камэдыя вытворчасьці «Саюзкіно»
Вялікая няпрыемнасьць
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
Каса—ад 5 гадз.

КІНО „Пралетары"
Ма такі фільм
Начны крык
Драма ў 7 частках.
Пачатак 1 сэансу а 7 г.
Каса адчынена ад 5 г.

КІНО-САД
Ад АЎТОРКА, 26-га ЖНІЎНЯ
Вядомы комік Дуглас Мак-Лін у лепшай замежнай камэдыі
ПАЗНАЁМЦЕ МЯНЕ
у 7 частках.
— Тольні 2 сэансы. —
Пачатак 1-га сэансу а 9 г., 2-га—10 г. 30 м.
КАСА АДКРЫТА з 6 г.

Мастацкі ЦЫРК | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА
Субота, 30 жніўня
СЕНЬНЯ! Усходняя артыстыя СЕНЬНЯ!
ЛАНГО
Азіяцкія Іюзіяністыя, муштроўшчыкі гадзюк-удавоў.
З БРЭНДЗІ 3—Ролікабежцы Ян. Ян. БОНІ—Сатырык
З МЕРАЛЬДО 3—Гледыятары 2 КАНВАЛЬДЗІ — быт-сатырыкі
УСЯ ТРУПА Ў ЛЕПШЫХ №№
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.
Канфэрансье Е. А. Яўгеней.
Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.
АНОНС! У нядзелю, 31 жніўня ВЯЛІКАЕ ДЗЁННАЕ ЗРОЛІШЧА для ДЗЯЦЕЙ

Кіно „СПАРТАК"
замежны выдатны фільм
ПАТАШ І ПЭРЛАМУТР
камэдыя ў 10 частках,
СЕНЬНЯ
УВАГА! УВАГА!
4 сэансы,
Пачатак сэансаў: 1 с.—6 г., 2 с.—7 г. 30 м. 3 с.—9 г., 4 с.—10 г. 45 м.
КАСА—ад 5 гадз.

Радиоцентр Западной области об'являет
с 31-го августа. с. г. в г. Смоленске на поступление в вокальный ансамбль (солисты, хористы) для обслуживания радиостудии гор. Смоленска),
КОНКУРС
Требуются голоса: женские (сопрано, контральто, мужские (тенора, баритоны, басы). Стаж не обязателен. Условия по соглашению. Иногородним участникам, подавшим заявления, высылаются соответствующие затребования, после которых—выезжать. Получившим затребования будет оплачен проезд в оба конца и 10 руб. квартирных и др. расходов. Деньги уплачиваются по приезде в Смоленск. Обязательно представление справки о годе рождения и списка репертуара (исполняемых вещей). Заседание конкурсной комиссии назначается 31 августа в 12 часов дня в помещении дома работников просвещения (Советская ул., рядом с Гортеатром).
Конкурс продлится 1 и 2 сентября.
Справки по тел. 7-12 с 10 до 3 часов дня или по почте в адрес: Смоленск, Радиоцентр (без марки).
Радиоцентр.

ПАТРАБУЮЦЦА два бухгальтары,
знаёмыя з вытворчасьцю, пажадана з лесазагатоўкамі.
Зьвяртацца па адрасе: м-ка Глуск, «Леспрамгас».

Абвестка
аб ПРЫЁМЕ ў 1930 годзе ў Гомельскі аўта-трактарны тэхнікум
Гомельскі аўта-трактарны тэхнікум, які знаходзіцца ў веданьні Галоўдартрансу БССР,
абвяшчае
працяг прыёму на 1 курс тэхнікуму.
Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў па аўтамабільным і трактарным рамонце, эксплёатацыі і тэхніцы па дарожных машынах.
ТЭРМІН НАВУЧАНЬНЯ 2½ гады.
Жадаючыя паступіць у тэхнікум павінны падаць наступныя дакументы: а) анкету, засьведчаную належнымі арган